ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
17 СНЕЖНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 244 (28102) Кошт 2000 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Я прыйшоў не за заробкам»



«Трыбуты» аспрэчылі тытул



Арка мудрасці Анатоля Скачака
СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«На асабістых прыёмах грамадзяне ставяць перад уладамі заканамерныя пытанні, і чыноўнікі абавязаны іх вырашаць. Абяцанняў ад нас яны не чакаюць, яны хочуць, каб вырашаліся іх жыццёвыя праблемы. Таму ўсё тое, што па розных прычынах не было зроблена, мы павінны цяпер, нягледзячы на ўсе цяжкасці, выканаць. Грамадзяне павінны мець добрае гандлёвае абслугоўванне, якасную медыцынскую дапамогу, дзіцячы сад і школу і, безумоўна, працу і гарантаваную зарплату. Гэта той мінімум, які ўлада павінна забяспечыць. Калі абяцалі — павінны зрабіць, іншага шляху няма».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18310,00 | ▲ |
| Еўра | 20045,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 259,87 | ▲ |
| Укр. грыўня | 779,15 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# СВЯТА ЎЖО З НАМІ!

**У мінулыя выхадныя ў Мінску пачаліся традыцыйныя пераднавагоднія кірмашы. На Кастрычніцкай плошчы, дзе ўсталявана галоўная ёлка сталіцы, і на плошчы каля Палаца спорту выстраіліся невялікія гандлёвыя крамкі, расквечаныя ілюмінацыяй. Тут можна выбраць сувеніры і цацкі. Кава і чай, свежая выпечка, а яшчэ смажаныя каштаны, глінтвейн і беларускія дранікі — усё гэта можна таксама пакаштаваць на свежым паветры, пад прыгожую музыку і радасны смех гасцей. На праспекце Пераможцаў каля святочнай ёлкі працуюць каруселі і атракцыёны. Пацеха і дзецям, і дарослым.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ФУНДАМЕНТ СПАРТЫЎНЫХ ПЕРАМОГ

## Ён закладваецца яшчэ ў юнацкім узросце

**Ужо 10-я па ліку цырымонія ўручэння імянных пасведчанняў стыпендыятам Прэзідэнцкага спартыўнага клуба адбылася ў Нацыянальным алімпійскім камітэце.**

У якасці стыпендыятаў на 2016 год вызначаны 176 маладых спартсменаў, спартсменаў-паралімпійцаў і 28 трэнераў-выкладчыкаў.



Фота БЕЛТА.

«Падняўшыся на верхні паверх Нацыянальнага алімпійскага камітэта, у Залу алімпійскай славы, мы апынуліся ў коле чэмпіёнаў, якія ўжо пабывалі на подыумах найбуйнейшых спаборніцтваў і ажыццявілі сваю спартыўную мару», — адзначыў **старшыня цэнтральнага савета рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб» Дзмітрый ЛУКАШЭНКА.** Ён падкрэсліў, што фундамент усіх значных перамог закладваецца менавіта ў юным узросце. «Цяпер ваша чарга! Амаль 80% сённяшніх стыпендыятаў з'яўляюцца прызёрамі чэмпіянатаў свету і Еўропы ў розных узростах, а больш за трэць з вас прыходзяць на цырымонію не ў першы раз», — сказаў Дзмітрый Лукашэнка.

Захоўваючы традыцыі, клуб імкнецца прытрымлівацца сучасных тэндэнцый развіцця сусветнага спорту. «У апошнія гады сярод стыпендыятаў з'яўляюцца прадстаўнікі новых відаў спорту, якія ўжо паспелі здабыць сваю папулярнасць. Памятаючы іх алімпійскія перспектывы, а таксама захапленні моладзі, клуб уважліва сочыць за вектарам развіцця сусветнага спорту», — адзначыў старшыня цэнтральнага савета клуба.

Паводле яго слоў, пераемнасць і традыцыі — важныя элементы поспеху ў спорце. Стыпендыі клуба на 2016 год удастоены і 28 трэнераў. «Прыемна бачыць, як былыя стыпендыяты Прэзідэнцкага спартыўнага клуба цяпер прысутнічаюць у якасці маладых перспектыўных трэнераў», — падкрэсліў Дзмітрый Лукашэнка.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

■ Купляй сваё!

# ЧАРНІЦЫ ДА НАВАГОДНЯГА СТАЛА

## У Глускім раёне падымаюць эканоміку за кошт замарожвання дароў лесу і не толькі

**Мясцовае райспажывутаварыства для Глуска вельмі значнае прадпрыемства. Яно гандлюе, будуе, вэндзіць, марозіць, займаецца экспартам.**
**Цэх па замарожванні грыбоў і ягад «Глускі кошык», які некалькі гадоў таму быў уведзены тут па праграме інавацыйнага развіцця краіны, дае магчымасць выпрабляць імпартазамяшчальны прадукт.**
**Раней, напрыклад, чарніцамі ў замарожаным выглядзе нас забяспечвала Польшча. Зараз гэты тавар на Захад пастаўляе Глуск.**

Тутэйшыя мясціны вельмі багатыя на каштоўную ягаду. Чарніцы запатрабаваны ў Еўропе, вялікімі партыямі яны ідуць у Польшчу, Літву, Расію, нават Амерыку. Летась ягады адгружалі за акіян, а сёлета нешта не пайшло. Затое Еўрасаюз параненейшаму ласуецца глускімі чарніцамі.

Сучаснае абсталяванне глыбокага замарожвання дазваляе атрымліваць прадукт найвышэйшай якасці. Каб было зразумела, як ён атрымліваецца, старшыня Глускага райспажывутаварыства Сяргей Зубчонак прапаноўвае ўсё пабачыць на свае вочы. Чарніцы, праўда, ужо скончыліся. Затое ёсць грыбы.

СТАР. 4

# ПРА БЯСПЕКУ І РАЗВІЦЦЁ

**Учора Прэзідэнт правёў дзве важныя нарады па надзённых для краіны пытаннях**

**На нарадзе па пытаннях бяспекі абмяркоўваліся сітуацыя бяспекі Беларусі, а таксама некаторыя пытанні асобных ведамстваў, у прыватнасці Следчага камітэта, дзе нядаўна быў прызначаны новы старшыня, і наогул сілавога блока. Пры гэтым Прэзідэнт у пачатку нарады асабліва адзначыў, што нельга выпускаць з-пад увагі сітуацыю з Украінай. Паводле яго слоў, той факт, што МУС затрымлівае на вакзале незразумелых людзей, сведчыць, што расслабляцца ні ў якім разе нельга.**

На мерапрыемстве кіраўнік пагранкамітэта праінфармаваў аб дзеяннях па ўмацаванні паўднёвай мяжы. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што з 1 студзеня пачынае дзейнічаць пагадненне Украіны з Еўрасаюзам. «Натуральна, гэтае пагадненне напружвае не толькі Расію, хоць заклапочанасць выказвалася і раней, больш за год таму, — падкрэсліў Прэзідэнт. — На сустрэчы ў Маскве Прэзідэнт Расіі звяртаў увагу на ўступленне ў сілу гэтага пагаднення, якое прывядзе да пэўных рызык для Расіі, для нас і Казахстана. Таму нам трэба быць гатовымі абмяркоўваць тыя пытанні — нам тром у ЕАЭС плюс Арменія і Кыргызстан — і з Украінай нейкім чынам папярэдне абмяркоўваць гэтыя праблемы».

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў Беларусі хапае і сваіх праблем у эканоміцы, але калі яшчэ хлынуць тавары з Еўрапейскага саюза, якія будуць увозіцца па нулявой стаўцы ва Украіну, то мала не падасца. «Таму ўсё, што мы рабілі па ўмацаванні паўднёвых рубяжоў нашай краіны ў плане бяспекі і эканомікі, аказалася сёння запатрабаваным», — адзначыў Прэзідэнт.

Праведзеная размова стала працягам тэмы, якая абмяркоўвалася на ўзроўні Прэзідэнта месяц таму на нарадзе па пытаннях дзейнасці сілавога блока. Кіраўнік дзяржавы заслухаў амаль усіх міністраў аб стане спраў у ведамствах, а таксама пра перспектывы далейшага развіцця. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу павышэння эфектыўнасці работы сілавога блока, якасці выканання пастаўленых задач. Абмяркоўвалася таксама выкананне канкрэтных даручэнняў Прэзідэнта, дадзеных на нарадзе месяц таму.

Акрамя таго, размова ішла таксама аб аптымізацыі ўсіх сілавых ведамстваў, але, вядома ж, у разумных межах, у тым ліку вызваленні ад непатрэбных функцый і за кошт гэтага — павелічэнні тых сілаў, якія рэальна працуюць над выкананнем пастаўленых задач.

Кіраўнік дзяржавы ўвогуле ацаніў работу сістэмы сілавога блока як эфектыўную і лічыць, што сёння не стаіць пытанне аб тым, каб кардынальна рэарганізоўваць і мяняць яе. Гаворка ідзе менавіта аб паляпшэнні працы кожнага ведамства па сваіх сферах дзейнасці.

**Учора таксама адбылася нарада па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця. На мерапрыемстве абмяркоўвалі склад будучага ўрада і некаторыя актуальныя пытанні ў эканоміцы, у тым ліку ў кантэксце праведзеных перагавораў у Маскве. «Што тычыцца складу ўрада, я прыняў рашэнне аб прызначэнні прысутных тут членаў урада на адпаведныя пасады — прэм'ер-міністра і віцэ-прэм'ераў. І хацеў бы пачуць ваш пункт гледжання, вашу ацэнку працуючых цяпер міністраў, перш чым канчаткова сфарміраваць урад», — падкрэсліў Прэзідэнт.**

Ён таксама нагадаў, што ўрад быў сфарміраваны яшчэ да прэзідэнцкіх выбараў: «Так другі раз у нашай гісторыі мы робім, каб людзі бачылі, хто будзе працаваць в ўрадзе, калі гэтага Прэзідэнта абіраюць». «Але, тым не менш, мы тады дамовіліся, што пройдзе нейкі час, паўгода, крыху больш, і будзе магчымасць і нам паглядзець на працу новага складу, і вызначыцца людзям, якія папрацуюць ва ўрадзе, можа, ім не спадабаецца», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Па ацэнцы Аляксандра Лукашэнкі, у нас працаздольны ўрад. Але юрыдычна яго трэба перапрызначыць, унесці прапанову па кандыдатуры прэм'ер-міністра на ўзгадненне Палаты прадстаўнікоў.

# АНДРЭЙ КАБЯКОЎ ПРЫЗНАЧАНЫ ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРАМ



**Учора Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 488 аб назначэнні прэм'ер-міністра.**

У адпаведнасці з пунктам 6 артыкула 84 Канстытуцыі на гэтую пасаду прызначаны Андрэй Кабякоў з наступным узгадненнем гэтага з Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Андрэй Уладзіміравіч Кабякоў нарадзіўся ў 1960 годзе ў г. Маскве. У 1983 годзе скончыў Маскоўскі авіяцыйны інстытут, у 1991 годзе — Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава і Інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання КПБ.

Працоўную дзейнасць пачаў майстрам механазборачнага цэха на заводзе імя С.І. Вавілава ў Мінску. В 1985-1988 гадах працаваў на заводзе «Дыяпраектар» у г. Рагачове, у 1988-1989 гадах — інструктар Рагачоўскага гаркама КПБ. У 1991-1995 гадах — начальнік планава-эканамічнага аддзела, намеснік дырэктара па эканоміцы — начальнік планава-эканамічнага аддзела завода «Дыяпраектар». У 1995-1996 гадах — намеснік начальніка Службы кантролю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 1996-1998 гадах — намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі. З чэрвеня 1998 года — прэзідэнт Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці. У 1998-2000 гадах — старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю. З 2000 года — першы намеснік прэм'ер-міністра, з 2001 года — намеснік прэм'ер-міністра. У 2002-2003 гадах — намеснік прэм'ер-міністра — міністр эканомікі. У 2003-2010 гадах — намеснік прэм'ер-міністра Беларусі. У 2010-2011 гадах — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. У 2011-2012 гадах — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі, пастаянны прадстаўнік Беларусі пры Еўразійскім эканамічным супольніцтве па сумяшчальніцтве. У 2012-2014 гадах — кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

Са снежня 2014 года — прэм'ер-міністр Беларусі.

■ Абараніць слабых

## Віцэ-прэм'ер Наталля КАЧАНАВА:

# «ВАЖНА СТВАРЫЦЬ УМОВЫ, КАБ БАЦЬКІ ДЗЯЦЕЙ-ІНВАЛІДАЎ МАГЛІ ПРАЦАВАЦЬ»

**Выязное пасяджэнне Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Наталлі Качанавай прайшло ў Баранавіцкім раёне на базе Гарадзішчанскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Удзельнікі пасяджэння пазнаёміліся з дзейнасцю дома-інтэрната, абмеркавалі пытанні абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, у тым ліку дзяцей-інвалідаў, вынікі рэалізацыі ў краіне глабальнай ініцыятывы Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) «Горад, дружалюбны для дзяцей», а таксама зацвердзілі план працы камісіі на 2016 год.**

Наталля Качанава паведаміла, што да яе паступаюць звароты наступнага характару: дзіця па дасягненні 18 гадоў заканчвае навучанне ў цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, узнікае пытанне, куды яму ісці далей. «Так, можна аддаць у інтэрнатную ўстанову, — адзначыла намеснік прэм'ер-міністра. — Але не кожны бацька гатовы пайсці на гэта. Часцей сем'і хочуць выхоўваць дзяцей самі, але разам з тым мець магчымасць не проста атрымліваць матэрыяльную дапамогу, але і працаваць, рэалізоўваць сябе. Аддзяленні дзённага знаходжання павінны працаваць і з такімі людзьмі. Гэта не проста гурток, куды можна прыйсці на 3-4 гадзіны, гэта павінна быць паўнавартаснае знаходжанне на працягу працоўнага часу». Віцэ-прэм'ер удакладніла, што гаворка ідзе пра тых, хто зможа там знаходзіцца па стане здароўя. Па яе словах, стварэнне ўмоў, калі бацькі змогуць працаваць, а іх дзеці будуць знаходзіцца пры гэтым у сям'і, — адна з найважнейшых задач.

У нашай краіне вельмі шмат зроблена па падтрымцы дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, выплачваюцца дапамогі, арганізуюцца мерапрыемствы па рэабілітацыі, сацыяльнай адаптацыі такіх дзяцей.

Гаворачы пра павелічэнне матэрыяльнай дапамогі для гэтай катэгорыі дзяцей, Наталля Качанава адзначыла, што памер яе залежыць ад росту заработнай платы. Пры наяўнасці эканамічных падстаў памеры дапамогі пераглядаюцца, праводзіцца іх пераразлік.

Віцэ-прэм'ер дадала, што ва ўстановах адукацыі, якія займаюцца падрыхтоўкай педагагічных кадраў, павінны быць спецыяльныя праграмы па працы з такімі дзецьмі.

Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр Румак у сваю чаргу адзначыў, што сем'і, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, адносяцца да катэгорыі сацыяльна слабых. Бацькам такіх дзяцей часта даводзіцца абмяжоўваць сваю працоўную дзейнасць у сувязі з неабходнасцю пастаяннага догляду дзіцяці. Так, амаль 62% маці і 28% бацькоў дзяцей-інвалідаў, нягледзячы на жаданне працаваць, вымушаны поўнасцю або часткова абмяжоўваць свой працоўны патэнцыял. Па словах намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, у няпоўных сем'ях сітуацыя яшчэ больш ускладняецца.

Дзяржава ажыццяўляе комплекснае суправаджэнне такіх сем'яў, аказваючы ім разнастайныя віды дапамогі і падтрымкі. На заканадаўчым узроўні прадугледжаны прававыя гарантыі ў сферы сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі, падатковай і жыллёвай палітыкі. Для паляпшэння гэтай працы Нацыянальным статыстычным камітэтам у 2016 годзе плануецца правядзенне выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, якое дазволіць комплексна вымераць узровень жыцця дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Дзякуючы гэтаму можна будзе вывучыць даступнасць паслуг у сістэме адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны для сем'яў з дзецьмі-інвалідамі, а таксама ацаніць іх патрэбы.

**Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■



Фота БЕЛТА.

■ Парламенцкі дзённік

# ЦІ ТРЭБА КАНТРАЛЯВАЦЬ САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ?

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў сустрэліся з членамі Рэспубліканскага маладзёжнага савета. Мэта сустрэчы — абазначыць праблемы, якія тычацца рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Як паведаміла журналістам дэпутат Інэса Кляшчук, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве, старшыня Рэспубліканскага маладзёжнага савета пры міністры адукацыі, ад членаў савета ўжо паступілі прапановы аб неабходнасці рэгулявання зносін моладзі ў сацыяльных сетках.**

### Старонкі без «смецця»

— Вы ведаеце, сёння наша моладзь у асноўным кантактуе праз інтэрнэт, — канстатавала дэпутат. — Трэба адсочваць звесткі, якія там распаўсюджваюцца. Расказваць маладым людзям, якую інфармацыю можна выкладваць на свае старонкі, а якую нельга.

Ідэю аб неабходнасці рэгулявання сацыяльных сетак падтрымлівае і **Міхаіл ЖУРАЎКОЎ, міністр адукацыі.**

— Натуральна, гэта неабходна, — упэўнены ён. — «Смецце», якое зараз там ёсць, усёдазволенасць — такога не павінна быць. Трэба, па-першае, усётакі глядзець, што там размяшчаецца, па-другое, любы сродак масавай інфармацыі павінен і вучыць, і кіраваць, і выхоўваць. Дэмакратыя не павінна асацыявацца з поўнай анархіяй.

### Дапамагчы маладым

Рэспубліканскі маладзёжны савет быў створаны 16 лістапада гэтага года. Ён лічыцца дарадчым кансультацыйным органам пры міністры адукацыі. Яго задача — дапамагаць у прыняцці рашэнняў, якія тычацца рэалізацыі маладзёжнай палітыкі ў нашай дзяржаве. Трэба сказаць, што ў Беларусі прыкладна 2 мільёны 200 тысяч маладых людзей, гэта каля 27% ад агульнай колькасці насельніцтва. Працуе прыкладна 270 маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў.

— У краіне моладдзю займаецца шмат дзяржаўных структур, грамадскіх аб'яднанняў, — адзначыў міністр адукацыі. — Каардынуючага, на маю думку, органа, які б сачыў за працай усіх дзяржаўных арганізацый, грамадскіх структур па стратэгіі развіцця маладзёжнай палітыкі, не хапала. Таму мы вырашылі зрабіць такі маладзёжны савет, куды ўвайшлі прадстаўнікі арганізацый, дзяржаўных структур для таго, каб абмяркоўваць розныя аспекты жыццядзейнасці нашай моладзі, не толькі студэнцкай.

Па словах Міхаіла Жураўкова, у савеце будуць разглядаць стратэгію маладзёжнай палітыкі, актуальныя праблемы, якія цікавяць моладзь нашай краіны. Не застануцца ўбаку і розныя бытавыя аспекты, такія як зарплата, жыллё, атрыманне адукацыі, павышэнне кваліфікацыі. Абмяркоўвацца будзе і прасоўванне моладзі па службе, прадастаўленне маладым людзям кіруючых пасад.

— На маю думку, у нас ёсць некаторыя праблемы з прасоўваннем моладзі па службовай лесвіцы, — прызнаўся Міхаіл Жураўкоў. — Гэта звязана не толькі з тым, што моладзь «не пускаюць». На жаль, не заўсёды малады людзі самі імкнуцца да гэтага, паколькі гэта вельмі нялёгкая праца. Акрамя таго, не заўсёды хапае кваліфікацыі, спецыяльнай падрыхтоўкі.

### У цэнтры дзяржаўнай палітыкі

Міністр паведаміў, што савет вельмі цесна ўзаемадзейнічае з парламентарыямі, якія разглядаюць пытанні маладзёжнай палітыкі. Так, на кожнай сесіі дэпутаты разглядаюць і прымаюць праекты законаў, якія закранаюць пэўныя аспекты маладзёжнай палітыкі.

**Аляксандр ЦАЦОХА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы,** падкрэсліў, што абарона правоў і інтарэсаў моладзі замацавана і ў Канстытуцыі.

— Сёння сфера абароны правоў і інтарэсаў моладзі рэгулюецца 8 кодэксамі, 20 законамі, прыкладна 40 указамі Прэзідэнта і больш чым 100 пастановамі ўрада, — удакладніў ён. — Менавіта дзяржава бярэ на сябе абавязкі стварыць усе неабходныя ўмовы для вольнага і эфектыўнага ўдзелу моладзі ў палітычным, сацыяльным і культурным развіцці краіны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

■ Адукацыя

# Новыя магчымасці для прафтэхшколы

**Паміж Еўрапейскім саюзам і ўрадам Рэспублікі Беларусь заключана Пагадненне аб фінансаванні праграмы «Занятасць, прафесійная адукацыя і навучанне ў Беларусі». У нашу сістэму прафесійнай адукацыі Еўрапейскі саюз плануе інвеставаць 11,5 млн еўра.**

— За гады, што прайшлі, у адрозненне ад многіх іншых краін, Беларусь не страціла сістэму прафесійнай адукацыі, а наадварот, значна развіла яе, удасканаліўшы механізм атрымання прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Разам з тым час дыктуе новыя патрабаванні. Рынку працы патрабуюцца новыя прафесіі, навыкі і кваліфікацыі, — падкрэсліў **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** — Сёння вельмі важна вырашыць пытанні занятасці і падрыхтоўкі як маладых людзей, так і дарослага насельніцтва. Я не сумняваюся, што цягам пяці гадоў дзейнасці гэтай праграмы мы значна прасунемся ў сферы ўкаранення новай сістэмы кваліфікацый, створым новыя рэсурсныя цэнтры і зможам перадаваць наш вопыт працы і навучання іншым краінам.

**Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза, пасол Андрэа ВІКТАРЫН** адзначыла, што яна вітае ўключэнне Беларусі ў Балонскі працэс і лічыць гэта важным крокам на шляху гарманізацыі сістэм адукацыі ўсёй Еўропы.

— Як сведчыць сусветны вопыт, сёння ўжо мала мець адну кваліфікацыю і адзін дыплом, трэба развіваць гнуткую сістэму атрымання адукацыі праз усё жыццё, якая дазволіць маладым людзям і грамадзянам любога ўзросту пастаянна вучыцца і атрымліваць новыя навыкі і кампетэнцыі, — адзначыла яна. — Пры гэтым важна, каб веды і навыкі, атрыманыя па-за рамкамі фармальнай сістэмы адукацыі, атрымлівалі прызнанне як з боку сістэмы адукацыі, так і наймальнікаў.

У Беларусі плануецца стварэнне і мадэрнізацыя 400 тысяч высокапрадукцыйных працоўных месцаў, што, несумненна, патрабуе падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі да 2020 года больш як 620 тысяч чалавек, у тым ліку 258 тысяч спецыялістаў для высокатэхналагічных навукаёмістых вытворчасцяў. Для вырашэння гэтых задач неабходна правесці адпаведныя змяненні ў сістэме прафесійнай адукацыі, аб'яднаўшы намаганні ў падрыхтоўцы кадраў сістэмы адукацыі, навукі і вытворчасці.

Асноўныя партнёры праграмы — Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства эканомікі, Нацыянальны статыстычны камітэт. Да ўдзелу ў мерапрыемствах праекта будуць актыўна прыцягвацца і розныя ўдзельнікі рынку працы, такія, напрыклад, як саюзы наймальнікаў, прафесійныя саюзы і грамадскія аб'яднанні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# ДЛЯ ЗДАРОЎЯ ЖАНЧЫН

**У Баранавічах урачыста адкрылі новы корпус радзільнага дома, у якім размясцілася гінекалагічнае аддзяленне.**

Будаўніцтва яго пачалося чатыры гады таму. Праект абышоўся бюджэту прыкладна ў 190 мільярдаў рублёў. У гэтую суму ўваходзіць крыху больш за 41 мільярд рублёў, якія выдаткаваў гарадскі бюджэт. Затое ў Баранавічах з'явілася сучасная гінекалагічная бальніца, аснашчаная па апошнім слове тэхнікі.

У новым чатырохпавярховым будынку знаходзяцца прыёмны пакой, аперацыйны блок, аддзяленне рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі, клінічная лабараторыя, фізіятэрапеўтычны і іншыя кабінеты. Устаноўлены сучасныя апараты для дыягностыкі. Палаты для знаходжання пацыентак зручныя і ўтульныя. На першым паверсе корпуса размешчана жаночая кансультацыя. Баранавіцкі радзільны дом абслугоўвае жанчын не толькі свайго горада і раёна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


Фота БЕЛТА.

■ Чулі?

# ПРЫВАТНЫЯ МЕДЫЦЫНСКІЯ ЦЭНТРЫ ЗМОГУЦЬ ВЫДАВАЦЬ БАЛЬНІЧНЫЯ ЛІСТЫ

**З 1 лютага 2016 года бальнічны ліст можна будзе атрымаць не толькі ў дзяржаўнай паліклініцы, але і ў прыватным медыцынскім цэнтры. Гэта вынікае з сумеснай пастановы Міністэрства аховы здароўя і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны «Аб некаторых пытаннях выдачы і афармлення лісткоў непрацаздольнасці і даведак аб часовай непрацаздольнасці», апублікаванай учора на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Гэтая пастанова ўносіць змены і дапаўненні ў Інструкцыю аб парадку выдачы і афармлення лісткоў непрацаздольнасці і даведак аб часовай непрацаздольнасці.

Дзеянне інструкцыі распаўсюджваецца на наступныя арганізацыі аховы здароўя: бальніца, шпіталь, медыка-санітарная часць, дыспансер, радзільны дом, цэнтр, паліклініка, амбулаторыя, клініка медыцынскай установы адукацыі, пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр, медыцынскі навукова-практычны цэнтр, медыцынскі рэабілітацыйны цэнтр, пункт аховы здароўя, фельчарска-акушэрскі пункт. Гэта значыць, усе гэтыя арганізацыі змогуць выдаць бальнічны ліст.

Таксама будзе дазволена выдача лісткоў часовай непрацаздольнасці дактарамі, якія ажыццяўляюць кансультацыйны прыём, урачамі прыёмных аддзяленняў бальніц, дыягнастычных цэнтраў, цэнтраў спартыўнай медыцыны. У перыяд лячэння пацыента ў аддзяленні дзённага знаходжання арганізацыі аховы здароўя, якая аказвае медыцынскую дапамогу ў амбулаторных умовах, бальнічны ліст выдаецца і падаўжаецца доктарам, які ажыццяўляе лячэнне.

Падаўжэнне або закрыццё лістка непрацаздольнасці (даведкі аб часовай непрацаздольнасці) ажыццяўляецца ў арганізацыі аховы здароўя, якая яго выдала.

***

Пашыраны пералік асоб, якім выдаюцца даведкі аб часовай непрацаздольнасці. Да іх ліку аднесены таксама асобы, якія ажыццяўляюць догляд хворага дзіцяці ва ўзросце да 5 гадоў, пры аказанні яму медыцынскай дапамогі недзяржаўнай арганізацыяй аховы здароўя ў стацыянарных умовах, на ўвесь перыяд знаходжання з дзіцем у гэтай медустанове.

У новым пераліку — і асобы, якія ажыццяўляюць догляд хворага дзіцяці ва ўзросце ад 5 да 14 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, пры аказанні яму медыцынскай дапамогі прыватнай арганізацыяй аховы здароўя ў стацыянарных умовах і пры заключэнні лекара, што дзіця мае патрэбу ў дадатковым доглядзе — на ўвесь перыяд знаходжання з дзіцем у дадзенай медустанове, на працягу якога гэтае дзіця мае патрэбу ў доглядзе.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Аграклімат

# МЯККАЯ «ЕЎРАЗІМА» БЯДЫ НЕ НАРОБІЦЬ

## Спецыялісты аграрнага сектара адзначаюць, што азімыя ў сёлетні цёплы снежань адчуваюць сябе пакуль даволі камфортна

**У снежні азімыя яшчэ не аказаліся ў стане глыбокага пакою, аднак існуючы тэмпературны рэжым не выклікае асцярогі за іх будучаю перазімоўку. Кіраўнік аддзела аграпрагнозаў Белгідраметцэнтра Надзея Мельчукова лічыць, што даволі працяглая хваля цяпла ў першым месяцы зімы цяпер айчынных аграрыяў моцна не пужае. «У мінулыя гады сустракаліся і цяплейшыя перыяды, і нічога — перажылі. Крыху павялічваецца кусцістасць азімых. Амаль штогод у снежні мы назіраем мяккую еўрапейскую зіму», — адзначае спецыяліст.**

### Цяпер чакаем снег

Вядома, пры такіх тэмпературах расліны губляюць закалку, разам з тым і нейкага інтэнсіўнага росту ў гэты час ужо няма. Мінусавыя тэмпературы ўначы не дазваляюць азімым, кустарнікам і пладовым дрэвам прачнуцца канчаткова. А пры паступовых зніжэннях тэмператур закалка аднаўляецца. Тут галоўнае, каб не было рэзкіх перападаў тэмператур, напрыклад моцных замаразкаў без снежнага покрыва. А сёлета сур'ёзных маразоў, ніжэйшых за мінус 10 градусаў, і не было. Для азімых небяспечнымі тэмпературамі без снегу лічацца маразы ад мінус 12-15 градусаў. Таму цяпер сіноптыкі разам з паніжэннем тэмператур чакаюць менавіта снегу.

Эксперты сёлета больш засмуціў кастрычнік, калі не хапала цеплыні для прарастання азімага рапсу ў Гомельскай вобласці. Аднак потым быў цёплы лістапад, які амаль цалкам выправіў становішча з усходамі. Праблемы з азімым рапсам у гэтым рэгіёне ёсць, але яны не крытычныя. Іх далейшы лёс будзе залежаць ад умоў перазімоўкі...



### 2015-ы абяцае стаць самым цёплым годам у Беларусі

Паводле папярэдніх падлікаў айчынных спецыялістаў, бягучы год можа стаць увогуле самым цёплым у нашай краіне за ўвесь час назіранняў. Так, у аддзеле клімату Белгідраметцэнтра журналісту «Звязды» паведамілі, што да гэтага самыя цёплыя былі 1989-ы і 2008-ы гады. Тады сярэднегадавая тэмпература паветра складала плюс 8,1 градуса. А сёлета гэты паказчык можа дасягнуць плюс 8,3 градуса, калі не будзе сур'ёзных маразоў у другой палове снежня. А іх нам і не абяцаюць.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Свята

# У НАС ТУТ СВАЯ АТМАСФЕРА

## Усё, што не забівае кінематограф, робіць яго мацнейшым

**Мы ствараем сваё кіно ўжо дзевяноста адзін год. Пастанова Савета Народных Камісараў «Пра кінавытворчасць у БССР» 1924 года стала кропкай адліку: з яе пачало сваю працу Дзяржаўнае ўпраўленне па справах кінематаграфіі і фатаграфіі «Белдзяржкіно», пасля яе стала здымацца беларуская кінахроніка, яе вынікам сталі першыя поўнаметражныя ігравыя беларускія фільмы «Прастытутка» і «Лясная быль». Сёння мы адзначаем Дзень беларускага кіно. Узрост не маленькі, праўда, ён не гарантуе поспех. Але нам усё ж такі ёсць пра што пагаварыць. 17 снежня як Дзень беларускага кіно — зручная дата, бо дазваляе падвесці вынікі года.**

**1. Міністэрства культуры правяло два адкрытыя рэспубліканскія конкурсы кінапраектаў.** У першым удзельнічалі 35 кінапраектаў ад 15 арганізацый кінематаграфіі, у другім — 31 кінапраект ад 7 арганізацый. З усіх пададзеных заявак 21 належыць кінастудыі «Беларусьфільм». Перамаглі адпаведна 5 і 6 кінапраектаў, з іх 2 — ад недзяржаўных арганізацый, астатнія належаць нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм».

**2. На пасаду дырэктара «Беларусьфільма» прыйшоў новы чалавек — Ігар Поршнеў.** А сама кінастудыя са студзеня па лістапад 2015 года атрымала з рэспубліканскага бюджэту 40,4 мільярда рублёў, з іншых крыніц — 15,2. З выкарыстаннем дзяржаўных сродкаў у 2015 годзе «Беларусьфільм» зняў тры ігравыя карціны — «Дзяржаўная граніца. Фільм 10: «Афганскі капкан», «Дзяржаўная граніца. Фільм 12: Няправільная мэта», «Участак лейтэнанта Качуры. Фільм 4. «Чорная павуціна», 26 неігравых фільмаў, 8 анімацыйных і 5 летапісных сюжэтаў. Сёння кінастудыя працуе над дзвюма ігравымі карцінамі («Сляды на вадзе», «Трымайся за аблокі»), 4 неігравымі і 10 анімацыйнымі. Акрамя гэтага, некалькі кампаній выказалі жаданне здымаць фільмы на базе «Беларусьфільма» — вядуцца перамовы, пралічваецца кошт дэкарацый.

**3. Спыніла сваё існаванне студыя спецыяльных праектаў «Белвідэацэнтр».** У 2013 годзе асобнае рэспубліканскае прадпрыемства па рашэнні Міністэрства культуры стала структурным падраздзяленнем нацыянальнай кінастудыі. Пра колькасць і якасць кінапрадукцыі «Белвідэацэнтра» ходзяць легенды: некалі гэта было паўнавартаснае і слаўнае прадпрыемства. З прыходам новага дырэктара нацыянальнай кінастудыі існаванне «Белвідэацэнтра» засталося ў мінулым. «У працэсе аптымізацыі вытворчасці ў мяне выявіліся дзве структуры, што займаюцца адным і тым жа — дакументальным кіно, хронікай, кіналетапісам, і дублююць свае дзеянні. Я прыняў рашэнне, што нам дастаткова аднаго «Летапісу», — пракаментаваў Ігар Поршнеў.

**4. У сферы кіно стаў прапрацоўвацца праект указа пра развіццё кінематаграфіі.** Той, што абавяжа атрымліваць у Міністэрстве культуры пасведчанне на здымкі фільма. Мяркуецца, што ўказ будзе падпісаны ў пачатку наступнага года, але пачне дзейнічаць не раней за 2017 год. «Праект указа аб развіцці кінематаграфіі дапрацаваны з улікам заўваг, выказаных членамі рабочай групы, прадстаўнікамі кінакампаній розных формаў уласнасці і сферы кіно. Улічаны таксама заўвагі прадстаўнікоў грамадскасці, агучаныя падчас прамых ліній. Праект указа разасланы ўсім зацікаўленым дзяржаўным органам, каб яны яго перагледзелі», — сказала **першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА.**

**5. Прызначаны новы тэрмін завяршэння рэканструкцыі «Беларусьфільма».** Яе гісторыя пачалася ў 2007 годзе і пасля шматлікіх пературбацый павінна была скончыцца ў канцы 2015-га. Але па апошнім рашэнні працы будуць весціся да канца 2016 года. Сёння, па словах Ігара Поршнева, над асноўнай пабудовай працуюць 200 чалавек, вядуцца ўнутраныя работы.

**6. Галоўнае — прыйшло разуменне, што будучыня беларускага кіно за незалежнымі кінематаграфістамі.** І калі раней такіх упэўненых спадзяванняў на незалежных аўтараў не было, то гэты год прынёс шмат адкрыццяў — і на кінафестывалі «Бульбамувi», і ў нацыянальным конкурсе «Лістапада». З'явілася надзея на тое, што заняпад апошніх гадоў хутка зменіцца пад'ёмам і, магчыма, «новай хваляй». Але надзею нам дае не нацыянальная кінастудыя, не фільмы, што атрымалі дзяржпадтрымку, а карціны, знятыя на ўласныя сродкі, падтрыманыя энтузіязмам творцаў. Час ужо дзяржаўнаму і недзяржаўнаму кіно станавіцца канкурэнтамі. Альбо памагатымі, бо першаму не хапае правільнага размеркавання сродкаў і кіравання, другому — грошай.

Сёлетні Дзень беларускага кіно сапраўды святочны.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Пашана і павага

# ЗЯМЛІ НАВЕК АДДАНЫЯ

**У маладзечанскім Палацы культуры прайшло ўшанаванне заслужаных людзей аграпрамысловага комплексу Мінскай вобласці. Гэтае мерапрыемства хтосьці назваў «Ветэранскімі дажынкамі».**

— Вашымі імёнамі ганарыцца Міншчына. Таму і вырашана зрабіць такія сустрэчы з ветэранамі традыцыйнымі, каб яшчэ раз аддзякаваць вам за нялёгкую працу на зямлі і вернасць прафесіі. Гэтыя сустрэчы — добрая нагода трымаць перад вамі своеасаблівую справаздачу: як развіваецца Мінская вобласць, якіх поспехаў дамагаецца, якія праблемы неабходна сёння рашаць, — звярнуўся да прысутных **старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА.**

Некаторыя з ветэранаў працягваюць працаваць і цяпер.

Упершыню ў 19-гадовым узросце сеў у кабіну трактара Фёдар Кудрэйка. І да гэтага часу Фёдар Яўменавіч кожны дзень ідзе на працу. Цяжка паверыць, але працоўны стаж механізатара агракамбіната «Дзяржынскі», ардэнаносца, — 61 год. Сёння яму 80, але ён бадзёры, поўны аптымізму. А ў вольны ад работы час з унукамі і праўнукамі працуе на прысядзібным участку, ходзіць у лес па грыбы ды ягады.

У Капыльскім раёне добра вядома імя Галіны Вечар, якая 40 гадоў адпрацавала брыгадзірам у жывёлагадоўлі саўгаса «Доктаравічы». У Галіны Яфімаўны шмат узнагарод: ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэн Працоўнай Славы III ступені, медаль «За доблесную працу» і залаты медаль ВДНГ СССР.

«Даводзілася ўставаць рана, у 4 гадзіны, таму што я даглядала цялятак. У мяне ніводнае не прапала. А ведаеце, што я рабіла? Я купляла па 50 капеек рыс, варыла ім рэдкую кашу і паіла. Яны такія моцныя раслі, прыгожыя», — згадвае былая цялятніца агракамбіната «Ждановічы» Мінскага раёна Валянціна Апанасаўна Ястрабава. Ці маглі быць дрэннымі вынікі работы пры такіх адносінах да справы? Агульны працоўны стаж Валянціны Апанасаўны — 59 гадоў.

Зусім не жаночую прафесію выбрала для сябе Галіна Груша з Дзяржынскага раёна. Галіна Антонаўна 33 гады працавала трактарыстам-машыністам у калгасе імя Фалько, узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны».

Зусім хутка заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі, намеснік старшыні СВК «Агракамбінат «Сноў» Нясвіжскага раёна Уладзімір Серафімавіч Бабёр адзначыць юбілей — паўстагоддзя работы ў адной гаспадарцы. Пачынаў брыгадзірам, потым шмат гадоў працаваў галоўным аграномам. Яго сыны таксама атрымалі агратэхнічную адукацыю, вярнуліся на малую радзіму. І бацька вельмі ганарыцца, што яны пайшлі па яго слядах.

Усяго ж у Палацы культуры Маладзечна сабралася 400 ветэранаў: механізатары, паляводы, жывёлаводы, спецыялісты, кіраўнікі гаспадарак, раёнаў і людзі, якія стаялі на чале Мінскай вобласці, аграрнага сектара краіны ў розныя гады.

Уладзімір Гаркун у Вярхоўным Савеце 12-га склікання ўзначальваў Пастаянную камісію па аграрных пытаннях і харчаванні. Ён, як ніхто іншы, помніць аб тых пераломных 90-х мінулага стагоддзя. Гэта былі найцяжэйшыя часы для маладой суверэннай дзяржавы. Прамысловасць і сельская гаспадарка, што называецца, «ляжалі», у казне не было грошай, збыт прадукцыі быў на «нулі», нават запасаў хлеба ў краіне ў нейкі момант заставалася на тры дні. «Сапраўды, было неверагодна цяжка. Але мы не разваліі краіну і не пусцілі яе пад адхон. У 1994 годзе адбыліся першыя выбары Прэзідэнта. І я ганаруся, што беларускі народ не памыліўся», — кажа Уладзімір Гіляравіч.

— Сярод нас знаходзіцца яшчэ адзін паважаны і заслужаны ардэнаносец. Можна сказаць, двойчы ветэран — Вялікай Айчыннай вайны і працы — Іван Фаміч Радына, — звярнуў увагу гасцей, удзельнікаў свята Сямён Шапіра. — Пасля заканчэння вайны ён прымаў самы актыўны ўдзел у аднаўленні калгаса «17 верасня», што на Валожыншчыне. Быў намеснікам старшыні, загадчыкам фермы. Некалькі дзён таму Іван Фаміч адзначыў 95-годдзе.

Вярнуў шаноўных ветэранаў у гады іх маладосці фільм аб мінулым і сучаснасці Мінскай вобласці. У кадрах хронікі некаторыя з іх пазналі сябе і нават расчуліліся.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Адпачынак

# ГАСЦЯМ ЗАЎЖДЫ РАДЫ

### З набліжэннем навагодніх свят айчынныя тураператары ўсё больш актыўна рыхтуюцца да прыезду замежных гасцей

**Для турыстаў арганізоўваюцца экскурсіі на любы густ. Усе ахвотныя таксама могуць наведаць Белавежскую пушчу ці ўбачыць культурную спадчыну Беларусі на аграсядзібах. Варта адзначыць, што турфірмы сталі больш гнуткімі ў сваёй цэнавай палітыцы, што робіць турыстычныя паслугі больш даступнымі.**

## Найбольш зацікавіліся турысты з Кітая і Венгрыі

Год для турызму цяжка назваць простым. Праз эканамічную і фінансавую нестабільнасць у многіх краінах свету гэты турыстычны сезон для Беларусі, напэўна, самы складаны за апошнія 7-8 гадоў. Як адзначае дырэктар Дэпартамента па турызме Мінспорту і турызму Вадзім Кармазін, гэта адчулася найперш з прычыны прыхільнасці да расійскага рынку, які прасеў на 40%. Але зараз сітуацыя пачынае паляпшацца. Паводле ацэнак некаторых расійскіх СМІ, суседзі выбіраюць зімовы адпачынак у Беларусі. Нашы здраўніцы, аграсядзібы, гарнальжныя комплексы карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Санаторыі і гасцініцы браніруюцца на Новы год загадзя. Попыт ёсць і на экскурсіі. За кошт гэтага і навагодніх праграм страчаны летам паток турыстаў аднаўляецца. Па краіне база гасцініц загружана на 40%, у сталіцы на 42%. Летась гэтыя паказчык былі на ўзроўні 32-33%. Таксама, па статыстыцы Нацбанка, расіяне сталі на 4% часцей ездзіць у дзелавыя паездкі ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

«Тым не менш, пакуль бачым, што расіян на навагоднія святы ў нас будзе на 10-12% менш, чым у мінулым годзе. Спад цікавасці на паездкі да нас таксама ёсць з боку Германіі і Польшчы — на 30%. Затое на 14% больш стала турыстаў з Кітая і на 23% з Венгрыі», — адзначае Вадзім Кармазін.

Каб не быць прывязанымі да расійскага рынку, Мінспорту і турызму стараецца прыцягваць турыстаў з іншых краін. Найперш з Еўропы, Кітая і Турцыі. Надзеі ўскладаюцца і на В'етнам, з якім плануецца падпісаць праграму супрацоўніцтва на 2016—2018 гады.

## Адмаўляюцца ад Еўропы

Вадзім Кармазін адзначыў, што па выязным турызме ў Беларусі няма такіх праблем, якія сёння назіраюцца ў Расіі. За 9 месяцаў адзначаны рост выязнога турызму па напрамках Турцыі (10%), Балгарыі (11%), Егіпта (15%), Грэцыі (10%). Што тычыцца егіпецкага і турэцкага варыянтаў адпачынку, то ад іх былі адмовы, аднак беларускі турбізнес падышоў да вырашэння пытання з сацыяльнай адказнасцю. Такія паездкі альбо адкладаліся на наступны год, альбо турыст атрымліваў альтэрнатыўную замену — Грэцыя, Іспанія, Турцыя.

Самалёты да сярэдзіны кастрычніка працягвалі вылеты ў Турцыю, а цяпер яны спынены з прычыны заканчэння сезона. Чартары на навагоднія святы ў Егіпет загружаюцца на 100%. Дарэчы, адпачынку ў гэтай краіне зараз цяжка знайсці альтэрнатыву. Напрыклад, Мексіка і Шры-Ланка не зусім падыходзяць праз аддегласць, бо да Егіпта ляцець каля 4 гадзін. Таксама варта адзначыць, што з 10 снежня «Белавія» прыпыніла рэйсы на егіпецкі курорт Шарм-эш-Шэйх з камерцыйных прычын. Перыяд прыпынення палётаў пакуль што невядомы. Што тычыцца Хургады, то аб'ём палётаў застанецца нязменным. Цікава і тое, што колькасць расійскіх турыстаў, якія жадаюць паехаць у Турцыю ці Егіпет праз беларускіх тураператараў, засталася на ўзроўні мінулага года — не больш за 1% на борце.

Таксама беларусы часцей сталі адмаўляцца ад тураў у Еўропу. Гэта псіхалагічная рэакцыя на тое, што там адбываецца. У асноўным зрываюцца навагоднія туры ў Парыж, Амстэрдам, Прагу. У сувязі з гэтым тураператары ўсё часцей прапануюць вялікія зніжкі па гэтых напрамках.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# ЧАРНІЦЫ ДА НАВАГОДНЯГА СТАЛА



**Сяргей ЗУБЧОНАК: «У нас шырокі асартымент».**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каля канвеера скрыні з шампіньёнамі. Іх высыпаюць на транспарцёр, па дарозе яны мыюцца, рэжуцца і падымаюцца ўверх для выпрабавання «шокам». У маразільным тунэлі іх чакае, як бы сказалі ратавальнікі, чырвоны ўзровень небяспекі. Магутныя вентылятары ствараюць моцны ледзяны вецер, ад якога сыравіна падскоквае ўверх і імгненна замарожваецца. З «маразільніка» яна выходзіць ужо ў гатовым для далейшага захавання выглядзе. Прымай толькі ды пакуй.

— Пры такім замарожванні амаль усе вітаміны захоўваюцца, — тлумачыць кіраўнік. — Бо ў гэтым выпадку ягады і грыбы цвярдзеюць адразу ж, а не пастуова, як у звычайным халадзільніку. І пры размарожванні добра захоўваюць форму, а не нагадваюць нейкую бясформенную кашу.

Дасягнуць такога эфекту дазваляе перадавое шведскае, італьянскае і расійскае абсталяванне. Падобнае ёсць і ў іншых вытворцаў, але ў кожнага свая спецыфіка. Напрыклад, на Гомельшчыне ў Брылёве аналагічны цэх спецыялізуецца на замарожванні зялёнага гароху і спаржавай фасолі, а на Брэстчыне ў Іванаве замарожваюць моркву, баклажаны і іншую гародніну.

— Сёлета ў глускіх лясах грыбоў сабралі мала, таму што была засуха, — кажа Сяргей Іванавіч. — Звычайна мы нарыхтоўвалі 20-25 тон за сезон, а ў гэтым толькі 2,5 тоны. Ледзь паспявалі прадаваць на кірмашах, тавар ішоў на ўра. Зараз працуем не на сваёй сыравіне, аказваем паслугі староннім арганізацыям.

Цэх у першаю чаргу прызначаны для замарожвання дзікарослых ягад. Ён і будаваўся з такой мэтай. З грыбоў тут марозяць выключна лісічкі і шампіньёны. Астатнія адварваюць, марынуюць і прадаюць. Найлепш продаж ідзе ў Мінску.

Замарожаная прадукцыя, дарэчы, не самая танная. «І наколькі выгаднае для прадпрыемства гэтае задавальненне?» — спрабую выведаць камерцыйную тайну.

— Электраэнергія даражэе, абслугоўванне абсталявання таксама дарагое, але калі б было нявыгадна, не займаліся б, — таямніча ўсміхаецца Сяргей Зубчонак.

Сёлета таварыства нарыхтавала 150 тон чарніц і на столькі ж аказала паслуг. Акрамя чарніц, марозяць тут і садовыя ягады. Наогул, асартымент складае 32 найменні.



**Праца ў разгары.**

У выйгрышы не толькі прадпрыемства, але і насельніцтва, якому яно дае зарабіць. Для рэалізацыі ёсць свая гандлёвая сетка. Акрамя крамаў населены пункты раёна, якіх тут 101, абслугоўваюць 5 аўталавак, яшчэ адну ў хуткім часе плануюць набыць.

Зараз на ўездзе ў Глуск будуецца чарговая стацыянарная крама.

— Яго ўпрыгожыць вежа накшталт той, што на гербе Глуска, — звяртае ўвагу яшчэ і на патрыятычны складальнік Сяргей Зубчонак. — Гэта наш своеасабліві брэнд. Будзем спадзявацца, што міма крамы з такой сімволікай ніякі нераўнадушны грамадзянін не пройдзе. Адпаведна імкнёмся падтрымліваць высокую планку і ў сваёй працы.

Райспажыўтаварыства вабіць пакупніка не толькі вежай на крамах і замарожанымі грыбамі-ягадамі. Тут таксама займаюцца вытворчасцю хлеба, пякуць і вырабляюць штомесяц 80 тон хлебабулачных і кандытарскіх прысмакаў. Акрамя гэтага, ёсць цэх па засолцы і вэнджанні рыбы. У смажаным выглядзе кілька, мойва і селядзец выглядаюць вельмі апетытна.

**Каментарый да тэмы:**

**Людміла ВАСІЛЕНКА, начальнік аддзела эканомікі Глускага райвыканкама:**

*— Райспажыўтаварыства — адна з нашых бюджэтаўтваральных арганізацый. Цэх замарожвання дае магчымасць зарабляць валюту. Удзельная вага яго прадукцыі ў агульным аб'ёме экспарту раёна складае 20%. Прадпрыемства працуе ў поўную сілу. На яго ўзбраенні сучаснае абсталяванне. Нават аўталаўкі, усе да адной, абсталяваны халадзільнікамі.*

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Добрае сэрца

# АБАВЯЗКОВА ЗБУДЗЕЦЦА!

**Традыцыйна ў рамках агульнарэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» Беларускі дзіцячы фонд праводзіць сваю дабрачынную акцыю «Нашы сэрцы — дзецям».**

Старт адбудзецца сёння ў сталічным клубе «Grand Bellagio», дзе збяруцца 70 сірот з дзіцячых дамоў сямейнага тыпу з розных абласцей. Дзетак чакае забаўляльная праграма ад сямейнага клуба CentroLIFE — інтэрактыўныя гульні, карагоды, квэсты, сустрэча з Дзедам Марозам і шмат чаго яшчэ. У гэты дзень мастакі правядуць майстар-класы па вырабе навагодніх сувеніраў.

Усе ўдзельнікі навагодняга свята напісалі напярэдадні лісты-жаданні Дзеду Марозу, а дзіцячыя мары абавязкова павінны здзейсніцца, як мяркуюць у Дзіцячым фондзе. Так і з'явіўся своеасаблівы марафон «Чароўны падарунак дзецям». Усе 70 пісьмаў аказаліся ў руках добрых чараўнікоў з розных кампаній, артыстаў і спартсменаў. Машынкі, канструктары, лялькі, настольныя гульні, гаджэты, спартыўныя прылады, наборы для творчасці — усё, што прасілі дзеці, будзе ўручана ім асабіста.

Аднак некаторыя лісты змяшчалі незвычайныя просьбы. Адна з дзяўчынак пажадала, напрыклад, наведаць разам з сям'ёй аквапарк. Нехта захацеў сустрэцца з Аленай Ланской — зразумела, што менавіта гэтая заслужаная артыстка Беларусі і стане госцяй дабрачыннага свята.

Па традыцыі Беларускі дзіцячы фонд наведае разам з валанцёрамі, артыстамі і казачнымі персанажамі дзіцячыя аддзяленні сталічных бальніц: 22 снежня — аддзяленне РНПЦ псіхічнага здароўя, 23 снежня — Рэспубліканскі дзіцячы кардыялагічны цэнтр, 24 снежня — апёкавае аддзяленне гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, 24 снежня — траўматалагічнае аддзяленне 6-й гарадской клінічнай бальніцы і іншыя.

Дабрачынная навагодняя акцыя БДФ працягнецца ва ўсіх абласцях і раёнах да 10 студзеня.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

17 СНЕЖНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 25 (15784)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Вольга КАЛЕСНІКАВА:

# «КАЛІ СПЯВАЮ, УСЁ АСТАТНЯЕ ПЕРАСТАЕ ІСНАВАЦЬ»



**Свой талент артысткі гэтая маладая дзяўчына пачала дэманстраваць дзесяць гадоў таму, удзельнічаючы ў розных конкурсах. Але пра жаданне стаць спявачкай заявіла толькі летась. Першыя песні, выхад кліпаў, сольны канцэрт — адказ на пытанне, наколькі ўдалым атрымалася тое пачынанне. Напярэдадні Новага года мы сустрэліся са спявачкай Вольгай Калеснікавай, каб не толькі падсумаваць вынікі, але і зазірнуць у будучыню...**

***— Летась вы заяўлялі пра тое, што распачынаеце сваё сольнае плаванне...***

— Прайшло крыху больш за год, а столькі ўсяго адбылося! Пасля конкурсу «Марская зорка» зрабілі першы сольны канцэрт-спектакль, над ім мы працавалі з кампазітарам Антонам Шакуліным, гукарэжысёрам Мікітам Касцюковічам і акцёрам Паўлам Хаджаевым. Мне дапамагалі прэзентаваць сябе калегі Тэа, Тарыел Майсурадзэ. Потым я па вушы ўехала ў працу на тэлевізійным праекце «Акадэмія талентаў». Плюс канцэрты па Беларусі, Расіі і шмат іншых падзей. Год быў няпросты, але цікавым і насычаным, багатым на адкрыцці. Бо мае калегі па сцэне — прыемныя людзі, якія ўмеюць шчыра радавацца тваім поспехам. Музычны матэрыял, што мы прадставілі ў канцэрце, не зусім «фармат» для радыё, таму зараз нам цікава зрабіць нешта такое, што ўпісалася б у гэтую нішу. Увогуле з часам пачынаеш разумець, наколькі важна гарманічна спалучыць тэндэнцыі ў музыцы з запатрабаваннямі аўдыторыі і сваім уласным жаданнем пра штосьці гаварыць.

Як асоба, я таксама стала больш загартаванай. Кожны выхад на сцэну — магчымасць размаўляць з публікай, што дапамагае артысту развівацца і знаходзіць новыя сілы для творчасці. Пасля гастроляў таксама з'яўляецца больш упэўненасці ў сабе.

***— Ці патрэбен маладому артысту прадзюсар?***

— Супрацоўніцтва з ім калі і дае фінансавую падтрымку, можа пазбавіць пэўнай творчай свабоды. Іншая размова — менеджар, які займаецца арганізацыйнымі пытаннямі. Я, як асоба творчая, магу суткамі прападаць у студыі, пісаць песні, прадумваць вобразы, а Арцём (А. Еўсіевіч — менеджар спявачкі. — **Аўт.**) — з цвярозым розумам думаць пра іншыя важныя моманты ў нашай працы. Бессэнсоўна нешта навязваць артысту, бо тады ён не будзе шчырым са сваімі слухачамі. У першую чаргу важна раскрываць талент, які табе дадзены. Ці гатовы ты пры гэтым сябе «ламаць» і падпарадкоўвацца чыімсьці парадам — кожны вырашае сам.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Студэнцкія гульні — 2015

# «ТРЫБУТЫ» АСПРЭЧЫЛІ ТЫТУЛ

## Як «сціплая дзяўчына ў шыкоўным касцюме» скарыла журы

**«Даўным-даўно людзі страцілі цягу да ведаў. Яны перасталі чым-небудзь цікавіцца. На зямлю апусцілася цемра, і ўсе загразлі ў руціне невуцтва. Але гэтаму паклалі канец вялікія: Ньютан, Эйнштэйн, Тэсла, Мендзялееў, Кюры. Каб чалавецтва ніколі не забывалася пра тыя смутныя часы, былі арганізаваныя студэнцкія гульні. Штогод выбраныя юнакі і дзяўчаты змагаюцца за званне найлепшага студэнта, каб паказаць усім, што неадукаваная цемра больш ніколі не прыйдзе на нашу зямлю. Пяць... Чатыры... Тры... Два... Адзін... Мы пачынаем студэнцкія гульні — 2015. Абвяшчаем парад трыбутаў»...**

**Вось такім нестандартным відэапралогам распачаўся фінал рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года». 9 трыбутаў (фіналістаў) выехалі на сцэну Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта на сігвеях. Аналогіі з суперпапулярным у моладзі блокбастарам «Галодныя гульні» напрошваліся самі сабой.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Тройка пераможцаў: Настасся Аўсейчык, Марыя Марчук і Міхаіл Карабіцкі.**

Пазнаёміцца з прафесіяй

# ЧЫМ ПАХНУЦЬ МЯХІ З ГРАШЫМА,

## або Каго бяруць у інкасатары

**Дзе патрабуюць крышталёва «чыстую» біяграфію і выдатную фізічную падрыхтоўку, хто працуе з раніцы да поўначы, і ці праўда, што грошы не пахнуць, высвятлялі карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены». Яны сустрэліся з інкасатарамі аднаго са сталічных філіялаў ААБ «Беларусбанк».**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Наша Каця прымерала бронекамізэльку...**

### ВЫДАТНАЕ ЗДАРОЎЕ І АРМІЯ ЗА ПЛЯЧЫМА

Артур Эксузьян працуе ў Беларусбанку ўжо 8 гадоў, зараз ён старшы інкасатар. Кажа, гэта толькі звонку ўсё бачыцца так, як у кіно, а на справе выглядае інакш.

— Навічкі праходзяць строгі адбор. Кандыдаты павінны прадэманстраваць добрую фізічную падрыхтоўку, здаць цэлы спіс нарматываў. Будучыя супрацоўнікі праходзяць таксама спецыяльныя тэсты, распрацаваныя псіхолагам, — тлумачыць Артур.

Акрамя гэтага, кожнага кандыдата правяраюць на прадмет судзімасці ў мінулым. Яшчэ адна ўмова — служба ў арміі. Апошняй інстанцыяй для будучага спецыяліста з'яўляецца стажыроўка. Навічок каля трох месяцаў ездзіць на інкасацыю з дзейнымі супрацоўнікамі. І толькі пасля здае залік камісіі.

Ігар Сакалоўскі, кіроўца машыны, у мінулым прафесійны спартсмен. Мужчына іграў за зборную Беларусі па гандболе. У скарбонцы інкасатара спартыўных узнагарод столькі, што ўсё і не пералічыць. Але сам ён лічыць, што ганарыцца трэба тым, як да цябе ставяцца твая сям'я і калегі. Дарэчы, пра апошніх. У рабоце інкасатараў вельмі важную ролю адыгрывае так званы камандны дух: зладжанасць у працы, давер адзін да аднаго.

— Не падумайце, што мы, як маленькія дзеці, выбіраем, з кім я хачу «сябраваць», а з кім не сяду ў адну машыну, — кажа Ігар. — Псіхолаг заўсёды ўлічвае тэмперамент і характар кожнага супрацоўніка, і, калі трэба, прапаноўвае свой варыянт складу брыгады.

Дыпломаў аб вышэйшай адукацыі тут не патрабуюць, але, па словах інкасатараў, юрыстаў і эканамістаў сярод іх хапае. Ёсць тут і самыя сапраўдныя дынастыі супрацоўнікаў: бацькі, сыны, унукі. Інкасатары жартуюць, што амаль кожны малады спецыяліст знаходзіць тут сабе другую палавінку. Артур са сваёй будучай жонкай, напрыклад, таксама пазнаёміўся ў банку. Яго другая палавінка працуе ў бухгалтэрыі.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
17 12 2015 г.

Медыяпрастора

# ЯК ПРАЙШОЎ ДЗЕНЬ У... ІНТЭРНЭЦЕ?

## Гэта можа залежаць ад умення сфарміраваць сваю стужку навін у сацыяльных медыя

**70% падлеткаў, нягледзячы на забарону, карыстаюцца падчас урокаў мабільнымі тэлефонамі ці іншымі гаджэтамі. Да такіх высноў прыйшлі аналітыкі Цэнтра даследаванняў сучаснага дзяцінства Інстытута адукацыі ВШЭ, апытаўшы больш за пяць тысяч маскоўскіх школьнікаў ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў.**

Сёння казаць пра ўплыў інтэрнэту на дзяцей і падлеткаў у прынцыпе няправільна, бо ён стаў для іх асяроддзем пражывання. Для пошуку адказу на пытанне «Як трэба жыць?» нашым бацькам даводзілася траціць гады, а пакаленне Z атрымлівае яго за долі секунды. Ад усіх іншых папярэдніх пакаленняў гэтых юнакоў і дзяўчат адрознівае тое, што яны з дзяцінства знаёмыя з лічбавымі тэхналогіямі. Літаральна нарадзіліся з iPad у руках.

— Інфармацыя самага рознага кшталту стала настолькі даступнай, што, не пытаючыся нашай згоды, сама льецца з кожнага тэлевізара, радыё або высвечваецца на экране камп'ютара. Прычым яна не проста льецца патокам, а неназойліва вучыць і выхоўвае, пакідаючы далёка ззаду бацькоў і настаўнікаў з іх патрабаваннямі, муштраваннем і маралізатарствам. У сітуацыі, якая склалася, здзіўляе і насцярожвае той факт, што мы, дарослыя, пад уплывам яркіх малюнкаў, ёмістых фраз, захапляльных гісторый дазволілі інфармацыі маніпуляваць нашай свядомасцю і, падпісаўшыся пад уласным бяссіллем, самі ж далі ёй (інфармацыі) магчымасць выхоўваць і вучыць сваіх дзяцей, — дзеліцца сваім меркаваннем **старшы выкладчык кафедры педагогікі БДПУ імя Максіма Танка Міхаіл КУДЗЕЙКА**. — Таму сучасная сістэма адукацыі не можа ігнараваць праблему ўплыву медыя. Заплюшчыць вочы і сказаць, што такой праблемы няма, — значыць уступіць адукацыйную ролю «паралельнай школе», якая існуе па сваіх медыязаконах жыцця, часта чужых грамадскіх нормах маралі і права. І калі айчынная сістэма адукацыі толькі спрабуе разабрацца, што ёсць медыяасвета і якую ролю яна адыгрывае ў жыцці чалавека, то шведскі вопыт дэманструе нам вельмі шырокі спектр спосабаў павышэння медыяадукаванасці падрастаючага пакалення...

— Яшчэ 20 гадоў таму я стаяў перад вучнямі і настаўнікамі і вучыў іх чытаць газеты, цяпер жа я вучу іх таму, як крытычна ставіцца да той інфармацыі, што ёсць у мабільных сродках. Раней захоўваў для працы сотні выразак з газет, а сёння іх мне замяніў інтэрнэт, — канстатуе **шведскі медыяпедагог Ёран АНДЭРСАН**, які прыняў удзел у медыясемінары для беларускіх педагогаў з інавацыйных пляцовак, што прайшоў у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі (у гэтым навучальным годзе ў Беларусі зацверджана 27 інавацыйных пляцовак па праблемах медыяадукацыі. — **Аўт.**). — Медыяландшафт моцна змяніўся. Інфармацыя паступае да моладзі з тысяч розных крыніц, і калі б мяне папрасілі вызначыць галоўны пункт медыяасветы, то я сказаў бы, што гэта ўменне крытычна ставіцца да таго, што ты чытаеш...

Даследаванні, праведзеныя шведскім медыясаветам, сведчаць, што 80 працэнтаў дзяўчатак ва ўзросце 16 гадоў кожны дзень праводзяць у інтэрнэце больш за тры гадзіны. Больш за палову шведскіх падлеткаў ва ўзросце 16 гадоў гуляюць у камп'ютарныя гульні больш за тры гадзіны на дзень. 80 працэнтаў 12-гадовых дзяцей маюць смартфон. І больш за палову дзяцей у пяцігадовым узросце ўжо ўваходзілі ў інтэрнэт.



**Ёран Андэрсан: «Інфармацыя паступае да моладзі з тысяч розных крыніц. І кожны карыстальнік сацыяльных сетак таксама аўтаматычна становіцца крыніцай масмедыя».**

— Тады паўстае заканамернае пытанне: як абараніць падрастаючае пакаленне ад няпраўдзівай і негатыўнай інфармацыі, якая распаўсюджваецца ў інтэрнэце з хуткасцю святла? — задае зусім не рытарычнае пытанне Ёран Андэрсан. — Раней, калі дзеці вярталіся са школы, бацькі ў іх пыталіся: «Як прайшоў дзень у школе?» А цяпер трэба цікавіцца: «Як прайшоў дзень у інтэрнэце?» Межы паміж віртуальным і рэальным жыццём сціраюцца.

> **«Як абараніць падрастаючае пакаленне ад няпраўдзівай і негатыўнай інфармацыі, якая распаўсюджваецца ў інтэрнэце з хуткасцю святла?»**

Па словах Ёрана, тое, што адбываецца ў сацыяльных медыя, нагадвае выбух, і ў настаўніка не заўсёды хапае часу, каб усё гэта адсачыць.

— Дваццаць гадоў таму мне было вельмі важна ведаць, якія адносіны складваюцца паміж вучнямі ў класе, каб не дапусціць цкавання адных другімі, а сёння цкаванне перанеслася ў віртуальную прастору — туды, дзе няма дарослых і можна не баяцца пакарання. Між іншым, шведскія школьнікі масава пакідаюць «Фэйсбук», таму што там знаходзяцца іх бацькі. У мяне чацвёра ўнукаў рознага ўзросту, і яны ўжо не выкарыстоўваюць свае акаўнты ў «Фэйсбуку», — распавядае Ёран. — Педагогі павінны тлумачыць вучням, што кожны карыстальнік сацыяльных сетак таксама аўтаматычна становіцца крыніцай масмедыя. Вельмі шмат падлеткаў выкладваюць у інтэрнэце інфармацыю, якую нельга размяшчаць, і яны не разумеюць наступстваў сваіх бяздумных паводзін.

Шведскім школьнікам расказваюць на ўроках пра этычныя правілы для прэсы, тэлебачання і радыё і прыводзяць прыклады этычных і неэтычных паводзін журналістаў і карыстальнікаў сацыяльных сетак, якія па-рознаму асвятляюць адны і тыя ж падзеі.

У 2000-х гадах у Швецыі адбыўся гучны выпадак з замахам на забойства. 20-гадовы хлопец паспрабаваў забіць сваю дзяўчыну, ударыўшы яе каменем па галаве, але тая па шчаслівай выпадковасці выжыла. За некалькі дзён ёй было зроблена сем аперацый. 19-гадовая дзяўчына доўга знаходзілася паміж жыццём і смерцю. Пра яе паведамлялі тэлебачанне і радыё, пісалі газеты. Усе з захапленнем сачылі за яе лёсам. Але ў прэсе не згадваліся ні імя дзяўчыны, ні імя маладога чалавека, які падазраваўся ў замаху на забойства. У першым выпадку не ведалі, ці дала б яна сама згоду на тое, каб усім стала вядомае яе імя (дзяўчына знаходзілася ў непрытомнасці). А ў другім — абаранялі сям'ю забойцы, якая ў гэтым выпадку была таксама пацярпелай. Калі дзяўчына ўстала на ногі, яна сама расказала журналістам сваю гісторыю, і з таго часу пра Эму вельмі шмат пісалі ў Швецыі. Але гэта было яе рашэнне.

А вось на даволі папулярным у Швецыі інтэрнэт-рэсурсе flashback.se вельмі шмат каментатараў адкрыта заклікалі забіць маладога чалавека, якога ў выніку пасадзілі на 12 гадоў. «Змест гэтага партала надзвычай сумніўны, там прысутнічае шмат нецярпімасці да людзей і падзей, што адбываюцца ў грамадстве. Тым не менш, калі я пытаюся ў вучняў, хто яго чытае, то высвятляецца, што чытаюць усе, — канстатуе Ёран. — Мяркую, многія сароміцца прызнацца, што і самі ўваходзяць у лік каментатараў».

Вось самыя тыповыя фразы, якія сустракаюцца ў інтэрнэце ў маладзёжным асяроддзі: «Здорава, што табе таксама падабаюцца каты», «Усе ведаюць, што ты дрэнна пахнеш», «Ідзі і накладзі на сябе рукі».

— Толькі ўявіце сабе, што мы з вамі п'ем каву і хтосьці ў кампаніі кажа: «Ідзі і застрэлься». Ці такое магчыма? — пытаецца Ёран. — А вось у інтэрнэце падобныя «прапановы», на жаль, не рэдкасць.

Разам з тым сацыяльныя сеткі могуць быць і адным з самых магутных стымулаў для навучання. Вельмі важна, каб вучні ўмелі правільна сфарміраваць сваю стужку навін у сацыяльных медыя. Бо яна можа складацца як з фотаздымкаў коцікаў, так і з ролікаў, якія дапамагаюць засвоіць законы фізікі, расказваюць пра тайны Сусвету, вучаць спраўляцца з рашэннем матэматычных задач, знаёмяць з робататэхнікай. І калі педагогі навучаць дзяцей гэта рабіць, то сацыяльная сетка перастане быць проста акенцам для забавак, аператворыцца ў дадатковы канал для навучання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

Паміж фізікам і лірыкам

**Адзін з сёлетніх лаўрэатаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў — 18-гадовы студэнт І курса факультэта камп'ютарных сістэм і сетак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Дзмітрый МІХАЙЛАЎ. Ён стаў ім дзякуючы сваім поспехам на 9-й міжнароднай алімпіядзе па астраноміі і астрафізіцы. Спаборніцтвы праходзілі гэтым летам у Інданезіі, і там Дзмітрый заваяваў бронзавыя медалі конкурсу.**

# У АДНЫМ ТАНЦЫ З ЗОРКАМІ

— Насамрэч, цікаўнасць да астраноміі была вынікам любові да фізікі, — усміхаецца хлопец. — Фактычна астраномія — гэта тая ж фізіка, толькі ў большых маштабах, сусветных. Таму і заданні на алімпіядах звычайна нагадваюць фізічныя. Скажам, ёсць умоўны метэарыт, які па нейкай траекторыі з пэўнай хуткасцю рухаецца ў бок Зямлі. Трэба пралічыць, ці сутыкнецца ён з нашай планетай. Калі так, то колькі энергіі выдзеліцца пасля ўдару, калі не — на якой адлегласці ён пройдзе. Але практычны аспект ніхто не адмяняў: ёсць і заданні на веданне зорнага неба, і ўменне арыентавацца ў прасторы пры дапамозе зорак.

У алімпіядах па астраноміі Дзмітрый пачаў удзельнічаць яшчэ ў 9 класе, прытым што ў школьным курсе выкладанне гэтага прадмета пачынаецца толькі ў 11-м. Ён наведваў факультатыў, арганізаваны маладой настаўніцай, якая сама раней брала ўдзел у такіх конкурсах. Сёлета па выніках рэспубліканскай алімпіяды адзінаццацікласнік сталічнага ліцэя №2 увайшоў у лік васьмі найлепшых. Пасля выніковага адбору быў вызначаны спіс з пяці чалавек, якія і накіраваліся ў Інданезію.

> **Дарэчы, на фізіцы і IT цікаўнасці Дзмітрыя не заканчваюцца. Хлопец ужо шмат гадоў іграе на фартэпіяна і саксафоне, а яшчэ займаецца... ірландскімі танцамі.**

— Нас добра падрыхтавалі, таму абышлося без нечаканасцяў, — кажа хлопец. — Падчас тэарэтычнага этапу трэба было рашаць задачы. У туры па аналізе даных — вызначыць, пра якое нябеснае цела ідзе размова, вылічыць іншыя параметры, пабудаваць графікі і г.д. Напрыклад, сказаць, якога тыпу зорка «загадана», і назваць іншыя яе характарыстыкі. Яшчэ было два практычныя этапы па назіранні за зорным небам. Першы — у планетарыі. Там прасілі знайсці якую-небудзь яркую зорку, адшукаць лішні аб'ект на небе ці, напрыклад, вылічыць час сутак па зорках. Другі праходзіў у будыйскім храме Барабудур. За некалькі гадзін да пачатку нам раздавалі міні-тэлескопы ў разабраным відзе: трэба было іх сабраць, навесці на Месяц, намаляваць, дзе праходзіць лінія раздзелу асветленай і неасветленай частак (у астранамічнай тэрміналогіі яе называюць тэрмінатарам), знайсці паўднёвы і паўночны полюсы спадарожніка і кратар Ціха, названы ў гонар дацкага астранома Ціха Брагэ. Яшчэ прасілі па памяці замаляваць участак зорнага неба.



**Беларуская каманда на алімпіядзе ў Інданезіі. Дзмітрый — у цэнтры.**

Астранамічная памяць хлопца сапраўды ўражвае. Па маёй просьбе ён лёгка пералічвае назвы ўсіх зорак, якія складаюць «коўш» Вялікай Мядзведзіцы, узгадвае самыя розныя лічбы і астранамічныя тэрміны... Не дзіва, што беларуская каманда выступіла на высокім узроўні — Дзмітрый і прадстаўніца Ліцэя БДУ Настасся Капінская заваявалі бронзавыя медалі.

Дзякуючы паспяховым выступленням на алімпіядах, цэнтралізаванае тэсціраванне Дзмітрыю здаваць не прыйшлося. Для атрымання вышэйшай адукацыі хлопец выбраў БДУІР, аб чым не шкадуе. Яму заўсёды хацелася займацца праграмаваннем, а на факультэце камп'ютарных сістэм і сетак даюць, па яго словах, найлепшую базу для развіцця ў любым кірунку. Ужо ёсць і свой праект — разам з сябрамі яны плануюць распрацоўку камп'ютарнай гульні ў жанры стратэгіі. Перспектыва займацца спартыўным праграмаваннем яму таксама даспадобы.

Дарэчы, на фізіцы і IT цікаўнасці Дзмітрыя не заканчваюцца. Хлопец сам кажа, што любому фізіку трэба цікавіцца лірыкам, а кожнаму лірыку не забівацца на фізічнае. Думку ён падцвярджае ўласным прыкладам — ужо шмат гадоў іграе на фартэпіяна і саксафоне, а яшчэ займаецца... ірландскімі танцамі.

— Мне ўвогуле імпануе культура Ірландыі, а танцы — адна з самых яскравых яе праяў. Зацікавіўся, калі вучыўся ў ліцэі. Наш выкладчык гісторыі таксама танцаваў і паралельна арганізаваў нешта накшталт гуртка. Пасля аднаго з іх канцэртаў прыйшоў на заняткі, неяк так і «ўцягнуўся». Ёсць калектыўныя танцы — кейлі. Іх структура жорстка прапісана, таму ніякай імправізацыі там няма, ацэньваецца ў першую чаргу выканаўчае майстэрства, сінхроннасць, — кажа хлопец. — А вось у сольных — на кожны рытм музыкі свае кампазіцыі, шмат розных рухаў. Гэта весялей, больш прасторы для творчасці.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*


Аляксей Тарасевіч: «Не магу ўзяць і пайсці. Ёсць адчуванне адказнасці».

Свой выбар

# «Я ПРЫЙШОЎ НЕ ПА ЗАРОБАК»

## Чаму малады музыка працуе выхавальнікам у інтэрнаце?

**Аляксей ТАРАСЕВІЧ — барабаншчык. Іграе альтэрнатыўную музыку і выступае разам з гуртамі «Петля пристрастия» і Botanic Prodject (да нядаўняга часу ў гэтым спісе быў і «Адыс Абеба»). Але пазнаёміліся мы не на канцэрце. А ў доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў у Навінках, што пад Мінскам, дзе Аляксей працуе выхавальнікам ужо 11 гадоў. Вучыць малых адзявацца і арганізуе канцэрты, каб сабраць для іх грошы на пуцёўкі ў летнік.**

### «ТЫ РАЗУМЕЕШ, ЯКІЯ ТУТ ДЗЕЦІ?»

— Я паступаў ва ўніверсітэт культуры, на факультэт мастацкай эстрады. Хацеў займацца сваімі любімымі барабанамі ўсё жыццё, — кажа Аляксей. — Але не ўзялі. І на другі год таксама. Потым ужо махнуў рукой. Паралельна я захапляўся псіхалогіяй, таму паступіў на псіхалагічны факультэт філіяла Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэта ў Мінску. Адразу пайшоў працаваць, каб быць незалежным. Уладкоўваўся хоць куды.

Хлопец быў і грузчыкам, і пекарам. Неяк улетку трапіў у дзіцячы лагер важатым. І зразумеў, што хацеў бы працаваць з малымі. Стаў абзвоньваць дзіцячыя садкі. Праўда, хутка ад гэтай ідэі адмовіўся: заробак не дазволіў бы жыць асобна ад бацькоў. Тады ж у мінскім інтэрнаце для дзяцей з псіхафізічнымі асаблівасцямі развіцця вызвалілася месца санітара. Аляксей, на той момант яшчэ студэнт, на гэту вакансію пагадзіўся. А праз два гады перайшоў у выхавальнікі.

— Дырэктар мяне спытаў: «Ты ўвогуле разумееш, якія тут дзеці?» — узгадвае хлопец. — Калі сюды прыходзіш першы раз, можа скласціся падманлівае ўяўленне, што ўсім ім балюча і дрэнна. Хтосьці крычыць, робіць дзіўныя маніпуляцыі... А потым разумееш, што малыя проста так успрымаюць гэты свет, і альтэрнатывы ў іх няма. Для іх гэты стан нармальны. Дзеці не ведаюць, што ёсць іншая норма. Напачатку я вельмі нерваваўся, бо не разумеў, што з гэтым рабіць. А з часам рэагуеш на ўсё спакайней.

Сярод абавязкаў выхавальнікаў — суправаджаць дзяцей на вуліцы і ў класе, дапамагаць развіваць сацыяльна-бытавыя навыкі, творчыя здольнасці і іншыя.

— Усё трэба паўтараць, штодзённа і па шмат разоў, каб дасягнуць нейкага поспеху, замацавання навыку. Звычайнаму дзіцяці дастаткова патлумачыць раз. А тут адзін момант прапусціў — і ўсё можа вярнуцца ў зыходны пункт. Для дзяцей дасягненне — навучыцца адзявацца, умывацца, чысціць зубы; запомніць, што выцірацца трэба сваім ручніком.

Выхаванцы тут вельмі розныя. І дыягназы розныя. Звыклая схема групавых заняткаў не падыходзіць. Хтосьці можа 15 хвілін сядзець, а камусьці і дзве хвіліны вытрымаць праблема.

Аляксей кажа, што ў многіх дзяцей ёсць бацькі. Некаторыя забіраюць малых на выхадныя ці на час адпачынку. Ёсць, на жаль, і тыя, хто прывозіць дачку ці сына і потым родзіца з'яўляецца. «Але я не бяруся асуджаць. Трэба спачатку пабываць на іх месцы, каб зразумець, чаму так адбываецца», — кажа хлопец.

### ДОБРА, КАЛІ ЁСЦЬ АДДУШЫНА

— Каля 5 мільёнаў атрымліваю, — адказвае на маё пытанне пра заробак Аляксей. — У мяне ёсць жонка і двое дзяцей. Жонка — галоўны мастак у тэатры лялек у Маладзечне. Калі б не падпрацоўка, было б вельмі складана.

Падпрацоўка — гэта аўтарская музыка, тое, што складаней за ўсё прадаць. Выступаюць усюды, куды запрашаюць.

— На жаль, у нас дагэтуль працуе сістэма, якой ужо нідзе няма: каб зрабіць канцэрт, ты мусіш арэндаваць памяшканне, гук (а не адыграць, а потым падзяліцца працэнтам з выручкі). Ты павінен увесь час рызыкаваць: не прыйдзе неабходная колькасць людзей — усё аддасі за арэнду. Можна і нічога не зарабіць.


Фота Надзеі БУЖАН.
Задача выхавальніка — дадаць у жыццё дзяцей больш станоўчых эмоцый.


Некаторым падапечным даводзіцца дапамагаць апранацца.

Ужо шэсць гадоў Аляксей арганізуе дабрачынныя канцэрты для інтэрната. Грошы ідуць на аздараўленне ўлетку. Раней сродкі збіраў валанцёрскі клуб «Міласэрнасць», што пры педуніверсітэце (ён і цяпер дапамагае інтэрнату), але гэтага было недастаткова. Тады вырашылі дамовіцца з некалькімі музычнымі гуртамі і паспрабаваць зладзіць дабрачынны канцэрт. Ідэя ўдалася. Цяпер штогод, звычайна ў маі, праводзяць канцэрт, за сродкі ад якога ў сярэднім атрымліваецца выкупіць дзве лагерныя змены на 20 чалавек. Некаторыя дзеці не могуць знаходзіцца ўсю змену. Тады пуцёўку разбіваюць на дваіх.

— Сёлета адкрыўся летнік «Расток», ён для дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў. І нашы малыя туды ездзілі. Але «фішка» нашага лагернага праекта ў тым, што вакол — звычайныя дзеці. Мы як асобны атрад удзельнічаем усюды, дзе можам. Дзеці — гэта добры праваднік. Дарослы можа саромецца спытаць. А дзеці ж падбягаюць: «А што гэта такое? А гэта заразна?» Тлумачыш ім усё — нармальна ўспрымаюць.

Цяпер летнік пайшоў інтэрнату насустрач. Суправаджальны персанал будуць уключаць у штат выхавальнікаў лагера, і ім не спатрэбіцца купляць пуцёўкі. А значыць, на грошы, якія вызваляцца, змогуць адпачыць яшчэ больш дзяцей.

***— А дочкі ведаюць, дзе вы працуеце?***

— Вядома. Старэйшая, ёй восем гадоў, нават у летніку з намі была. Выхоўваем у традыцыях талерантнасці. Школа, вядома, дае сваё. Дачка прыносіць розныя слоўцы адтуль. «Даўнам» там абзываюцца. Я кажу: «А памятаеш Дзіму? Дык вось у яго сіндром Даўна. Патлумач сваім таварышам, што гэта крыху не тое, што яны думаюць».

***— Вам ніколі не хацелася пайсці на іншую працу? Больш прэстыжную, з вялікім заробкам?***

— Бывае такое жаданне, што хітраваць, — прызнаецца хлопец. — Але ж я першапачаткова прыйшоў не па грошы. Дый прырастаеш да месца. Гэтую старонку жыцця так проста перагарнуць немагчыма. Ёсць адчуванне адказнасці. Часам, праўда, усё так надакучае... Чулі аб прафесійным выгаранні? Добра, калі ёсць аддушына. У мяне гэта музыка.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

Аддаўшы — знойдзеш

# Добрыя справы клічуць у дарогу

## Да тых, каму не хапае цеплыні

**«Дарогаю дабра» — не толькі назва атрада: гэта, хутчэй, заклік да дзеяння. Нягледзячы на тое, што ўсе валанцёры ўжо не бестурботныя студэнты, а работнікі вялікага прадпрыемства, з раніцы да вечара занятыя на працы, яны знаходзяць час, каб абмеркаваць, чым дапамагчы дзецям з хоспіса, адзінокай матулі, у якой на выхаванні хворае дзіця, або шматдзетнай сям'і. Кожны з іх можа прыгадаць не адну шчымлівую гісторыю пра сваіх падапечных, але не пра ўсё будзеш расказваць.**

— Дапамагаем таксама хлопчыкам і дзяўчаткам з дзіцячага дома, — распавядае **сакратар пярвічкі з правамі раённага камітэта БРСМ бабруйскага прадпрыемства «Белшына» Наталля РУСІНОВІЧ**. — Здаровых дзяцей там амаль няма, іх забіраюць у сем'і. Застаюцца тыя, каму сапраўды не хапае цяпла. І мы ходзім туды пастаянна. Такога, каб мы займаліся кімсьці адным, няма. Навошта хлусіць? Кожнае дзіця чакае, што яго возьмуць у сям'ю. Мы ж імкнёмся быць ім сябрамі, каб у іх жыцці было крыху больш прыемных хвілін.

Шчодрага сэрца валанцёраў хапае і на дзяцей, якія жывуць у сем'ях, дзе іх бацькі лічаць кожную капейку.

— Работнікі «Белшыны» ахвотна адгукаюцца на нашы заклікі, прыносяць цацкі, адзенне, прысмакі, дапамагаюць з транспартам, — расказвае **Вольга ПАНАСЮК, спецыяліст па рабоце з моладдзю**. — Летась нашы дзяўчаты з цэнтральнай завадской лабараторыі зрабілі вельмі шчодрыя падарункі. Нават у каробачкі паклалі і падпісалі, каму што ўручыць.

Неяк збіралі макулатуру і атрыманыя грошы пералічылі дзіцячаму хоспісу. А нядаўна прымалі ўдзел у гістарычнай гульні з элементамі арыентавання на мясцовасці «Загадкі і таямніцы Бабруйскай крэпасці». Сертыфікат на паўмільёна рублёў за першае месца каманда аднадушна вырашыла перадаць на набыццё цацак для дзіцячага дома.

У электроннай базе безліч фота са шчаслівымі тварамі дзяцей. Вось яны разам з валанцёрамі катаюцца на арэлях, вось ядуць смачны торт, малююць, гартаюць кнігі. Як толькі праходзіць адна акцыя, пачынаецца падрыхтоўка да наступнай. Не так проста бывае знайсці сродкі да чарговага свята. Каб у падапечных засталіся на памяць не толькі добрыя ўспаміны, але і падарункі, праз групу "УКантакце" валанцёры шукаюць спагадлівых людзей.

Тых, хто аднойчы ўлуўся ў валанцёрскую справу, ужо не трэба ўгаворваць нешта зрабіць. Яны адгукаюцца па першаму покліч у. Як клоўн Клёпа — бабруйскі прадпрымальнік Андрэй Яўсееў. Ён не працуе на прадпрыемстве. Неяк валанцёры запрасілі яго за грошы паўдзельнічаць у свяце для дзяцей. Цяпер Андрэй таксама ў камандзе і грошай за свае паслугі не бярэ. Яго ў дзіцячым доме чакаюць з асаблівым нецярпеннем. Разам з дзецьмі ён запускае паветраныя шары, робіць шоу мыльных бурбалак. Не шкадуюць свайго часу і прафесійныя фатографы, якія не стамляюцца фіксаваць усе гэтыя хвіліны радасці. Менавіта дзякуючы ім наведвальнікі сацыяльных сетак могуць бачыць, што падарыць шчасце іншым зусім не складана, трэба гэтага толькі захацець.


Валанцёраў з «Белшыны» ў Бабруйску ведаюць па канкрэтных справах.

— Марына Чылік, я, Юля Каліноўская, Надзея, Юля, Гена, — Наталля пералічвае ўсіх пайменна, хто ў абдымку з дзецьмі ўсміхаецца з фота. — Аднойчы нас узнагародзілі экскурсіяй у Вільнюс. І мы вырашылі, што прывязём адтуль нашым дзецям шмат розных цацак. Колькі потым было радасці!

Шмат прыемных успамінаў засталося ад сумесных падарожжаў у аграсядзібу «Экзотыка» пад Бабруйскам, дзе жывуць заморскія жывёлы, і ў Буйніцкі заасад пад Магілёвам.

...Юлія Каліноўская, нагледзеўшыся ў свой час мульцікаў пра Чыпа з Дэйлам, з дзяцінства марыла дапамагаць іншым. На «Белшыне» яна адна з лідараў валанцёрскага руху. Гэтай абаяльнай дзяўчыне хапае часу не толькі на дзяцей, але і на братоў нашых меншых. У таварыстве ахоўы жывёл «Дабрадзейнасць» яна таксама свой чалавек. У выхадныя замест таго, каб бавіць час у сацыяльных сетках або каля тэлевізара, спяшаецца ў мясцовае спецаўтапрадпрыемства — службу, якая займаецца адловам бадзяжных жывёл. Часова яны жывуць у існуючым там прытулку, і трэба як мага хутчэй знайсці ім пастаянных гаспадароў. А пакуль іх няма, неабходна навадзіць парадак у вальерах, карміць гадаванцаў. Юля яшчэ і ініцыятар розных акцый у падтрымку бяздомных жывёл, бо трэба знайсці грошы, каб было на што іх карміць. «Калі дорыш камусьці часцінку свайго шчасця і радасці, сам становішся дабрэйшым. І чым больш аддаеш, тым больш атрымліваеш узамен», — упэўнена яна.

Наогул такіх, з каго можна браць прыклад, хапае. Вікторыя Абазіна, Яўген Арцімовіч, Надзея Дуброўка, Святлана Кушнарова, Юлія Міронава, Каця Палянская, Алена Скурат, Генадзь Шкандаровіч... Яны замест банальнага спачування робяць канкрэтныя справы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# «ТРЫБУТЫ» АСПРЭЧЫЛІ ТЫТУЛ

## Інтрыга: хлопцы супраць дзяўчат

Замахнуцца на ганаровае званне адважыліся: студэнт IV курса будаўнічага факультэта Беларуска-Расійскага ўніверсітэта Міхаіл КАРАБІЦКІ, студэнтка II курса факультэта мастацтваў і дызайну Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы Настасся АЎСЕЙЧЫК, студэнтка IV курса фармацэўтычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Вольга СЯЧКО, студэнтка II курса эканамічнага ўніверсітэта Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандра БАРЫСЕНКА, студэнт IV курса інжынерна-тэхналагічнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Мікалай РОЗУМ, студэнтка II курса філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Ганна ПЛАХАТНЮК, студэнтка III курса факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Марыя МАРЧУК, курсантка II курса інжынернага факультэта Камандна-інжынернага інстытута МНС Марына ВІШНЕЎСКАЯ і студэнтка V курса архітэктурнага факультэта БНТУ Аляксандра МУРЗОЎСКАЯ. Усе яны сталі пераможцамі рэгіянальных этапаў. Два хлопцы і сем дзяўчат! «Ці ёсць нейкія тлумачэнні ў такога відавочна жаночага раскладу фіналу?» — пацікавіліся мы ў **сакратара ЦК БРСМ Дзмітрыя ВАРАНЮКА**.

— Напэўна, дзяўчаты больш актыўныя і больш паспяховыя ў вучобе, — падзяліўся ён сваёй думкай. — Каб стаць удзельнікам праекта «Студэнт года», сярэдні бал канкурсанта не можа быць ніжэйшым за 8 балаў! Малады чалавек павінен актыўна праявіць сябе ў дзейнасці пярвічнай арганізацыі БРСМ, студэнцкім самакіраванні, раённых, гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах, займацца навукова-даследчай дзейнасцю... А таксама мець здольнасці да творчага экспромту, высокую эрудыцыю, уменне весці палеміку і, самае галоўнае, — працаваць у камандзе, бо за кожным фіналістам стаіць вялікая каманда студэнтаў з яго ВНУ!

Між іншым, за чатыры гады правядзення конкурсу «Студэнт года» перамагалі ў ім толькі дзяўчаты. Невыпадкова сталі жартаваць: а ці не перайменаваць нам конкурс у «Студэнтку года»? Інтрыга павінна была вырашыцца праз некалькі гадзін — хто пераможа на гэты раз?

## Палімерныя чыпсы і кіраўніцкія паядынкі

Распачалося ўсё з абароны праекта. Вольга Сячко прадставіла на суд журы даследчую работу, прысвечаную ваенным медыкам — супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Мікалай Розум прэзентаваў свой сайт «Вступотряде.by».

— Гэта ўніверсальная пляцоўка для аб'яднання студатрадаўскага руху Беларусі. Сацыяльная сетка, якая дапамагае маладым людзям падабраць для сябе будатрад, знайсці працу і сяброў, — патлумачыў хлопец. — Праект запушчаны месяц таму, і пакуль мы працуем на Віцебскі рэгён, але наша мэта — ахапіць усю краіну і выйсці на расійскія будатрады.

Мікалай цудоўна ведае гэту сферу: за актыўны ўдзел у студатрадаўскім руху студэнт атрымаў шэраг узнагарод. У верасні Мікалай узначаліў штаб працоўных спраў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і цяпер дапамагае студэнтам свайго ВНУ знайсці працу ў вольны ад вучобы час.

На рэспубліканскі маштаб замахнулася і студэнтка БДУІР Марыя Марчук. Ва ўніверсітэце ўжо не першы год паспяхова дзейнічае Маладзёжнае тэлебачанне БДУІР. У сацыяльнай сетцы «УКантакце» ў яго налічваецца 1,5 тысячы падпісчыкаў і крыху менш на YouTube. «Мы прапануем стварыць у краіне адзіны маладзёжны тэлеканал, каб асвятляць у рэпартажах падзеі ва ўсіх ВНУ краіны», — патлумачыла Маша.

Міхаіл Карабіцкі прапанаваў журы азнаёміцца з новым будаўнічым матэрыялам, які не мае аналагаў на рынку, — палімернымі чыпсамі.

— Па-першае, гэта экалагічна (мы перапрацоўваем другасную сыравіну і тым самым вызваляем зямлі ад смецця), па-другое, практычна і эканамічна, і, па-трэцяе, — эстэтычна і арыгінальна (чыпсы магчыма пафарбаваць у розны колер). Састаў можна выкарыстоўваць для выканання вонкавых аддзелачных работ.

Будучая настаўніца беларускай мовы Ганна Плахатнюк распрацавала праект па папулярызацыі сярод моладзі роднай мовы «Будзем размаўляць па-беларуску». Аляксандра Мурзоўская расказала пра стварэнне ў БНТУ студэнцкай куратарскай службы. Гэты орган студэнцкага самакіравання дапамагае першакурснікам хутчэй і прасцей уліцца ў студэнцкія будні, уцягнуць іх у грамадскае, навуковае і спартыўнае жыццё факультэта. Аляксандра Барысенка распавяла пра клуб кіраўніцкіх барацьбы і кіраўніцкія паядынкі. Гэта сацыяльная гульнявая тэхналогія па навучанні будучых менеджараў. Гульня праходзіць паміж двума гульцамі ў форме вырашэння канфліктнай сітуацыі. А Марына Вішнеўская з Камандна-інжынернага інстытута МНС агучыла прапанову па стварэнні і дзейнасці ў краіне маладзёжных атрадаў выратавальнікаў.

## З «Тэлевяршыні» — на вяселле

Цікавымі і запамінальнымі атрымаліся ў многіх з канкурсантаў і іх «візітоўкі». Для таго, каб пазнаёміць — у любой творчай форме — усіх са сваёй персонай за чатыры хвіліны, Мікалай Розум напісаў верш. А каб «гісторыя жыцця» ў вершаванай форме не заняла больш часу, чым адведзена, вырашыў пакінуць у сваім аповедзе пераважна адны дзеясловы: «... Рос, гуляў і развіваўся. Лічыў, пісаў, фарміраваўся. Вырас, дапісаў і давучыў. Рыхтаваўся і паступіў. «Сабраўся — да канца давядзі, старайся, бацькоў не падвядзі». Спяваў, вучыўся, вывучаў. Сеў, падумаў, ай, засумаваў... «Пець умееш?» — раздалося. Прыйшоў, выступіў і «паняслося». Спяваў, танцаваў, праводзіў, аб'яўляў. Жартаваў, выступаў, скараў, перамагаў. Працаваў, кіраваў і ўзнагароду атрымаў». Праца ўсё ж будзе... (Забягаючы наперад, скажам, што кампазіцыя «Касіў Ясь канюшыну» ў выкананні «РОЗУМбэнда» ў творчым этапе конкурсу стала хітом гэтага вечара. Так што спяваць Коля і сапраўды ўмее. Невыпадкова яго называюць чалавекам-аркестрам...)



Марыя Марчук у вобразе Астапа Бэндара: «Лёд крануўся...».

Міхаіл Карабіцкі інсцэніраваў уручэнне штогадовай нацыянальнай прэміі «Тэлевяршыня» ў 2020 годзе. Дарэчы, будучы інжынер-будаўнік ужо некалькі гадоў працуе вядучым маладзёжнай тэлеперадачы «Альма-матар» на абласным тэлебачанні «Беларусь 2» і каментуе на гарадскім стадыёне не толькі беларускія, але і міжнародныя матчы па футболе. Сярод прэтэндэнтаў на званне найлепшага вядучага рэгіянальнага тэлебачання — вядучы праграмы «Сельскае жыццё» Жэрар Дэпард'е, тэлеканал «Беларусь 88», аграгарадок Ратамка, Мінскі раён; вядучы праграмы «Іграй, гармон» Аляксандр Саладуха, тэлеканал «Беларусь 37», гарадскі пасёлак Радашковічы, Маладзечанскі раён. Ну і, зразумела, Міхаіл Карабіцкі, тэлеканал «Беларусь 2»...



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Настасся Аўсейчык: конкурс «Візітоўка».

**«Пець умееш?» — раздалося. Прыйшоў, выступіў і «паняслося». Спяваў, танцаваў, праводзіў, аб'яўляў. Жартаваў, выступаў, скараў, перамагаў. Працаваў, кіраваў і ўзнагароду атрымаў».**

Вольга Сячко — будучы фармацэўт — прадставіла ўвазе гледачоў медыцынскі капуснік. Увіце сябе вяселле ў сям'і медыкаў. Выкуп за нявесту доўжыцца чацвёрты дзень. «Чтобы дальше вам пройти, за бахилы заплати». «Чтобы быть вам долго вместе, угадай, где ЭКГ невесты». «Сразу видно, ты новатор — испытай дефибриллятор».

## «Лёд крануўся, спадары...»

У конкурсе аратарскага майстэрства галоўнай задачай, якая стаяла перад канкурсантамі, было даказаць перспектыўнасць сваёй прафесіі.

— Мы ўсе марылі ў дзяцінстве быць касманаўтамі, пажарнікамі, дальнабойшчыкамі, але я не прыгадаю, каб хтосьці сказаў: «Я мару стаць нафтавіком»... І вось я задумаўся, а што ўва мне павінна быць такога, каб я мог далучыцца да прадстаўнікоў гэтай прафесіі? І знайшоў дзве важныя якасці — упэўненасць і адказнасць. Нафтавік — прафесія толькі для ўпэўненых у сабе людзей, — лічыць Мікалай Розум.

Для Аляксандры Мурзоўскай архітэктура — тое, што дае свабоду творчасці і самавыяўлення, але і дыктуе свае правілы: «Трэба ведаць людзей і горад, адчуваць іх, паважаць мінулае, але і думаць пра будучыню. Я вучуся глядзець шырэй, звяртаць увагу на дэталі, шукаць альтэрнатыўныя рашэнні. Не бывае ідэальнай прафесіі для ідэальнай будучыні. Затое ёсць прызванне. Менавіта яно гарантуе ваш поспех. Я архітэктар да мозгу касцей. І я ні за што не спынюся».

Але, напэўна, самым яскравым і запамінальным стала выступленне будучага праграміста Марыі Марчук у вобразе Астапа Бэндара: *«Престижно, достойно и прибыль хороша. Всё есть для счастья, и так поет душа...»*.

— Але хто такі праграміст? Гэта гігант думкі, сын славянскага матаналізу. Асоба, набліжаная да інтэграла. У вас ёсць смартфон? Дык вось усё, што ёсць у вашым смартфоне, — вынік плённай працы праграмістаў. «Але дзе ж узяць гэтых светлых людзей?» — запытаецеся вы. Вам патрэбна класная адукацыя ў сферы ІТ? Яна ёсць у Беларусі. Найлепшыя ўніверсітэты — БДУ, БНТУ, ну і, вядома, БДУІР! Я пачала працаваць па спецыяльнасці ўжо гэтай восенню. А што гэта азначае? Гэта азначае, што лёд крануўся, спадары... Лёд крануўся...

На пытанне ад членаў журы, кім жа Маша бачыць сябе ў будучыні, улічваючы яе актыўны ўдзел у рабоце Маладзёжнага тэлебачання, дзяўчына адказала: «Хачу развівацца гарманічна. Мой універсітэт рыхтуе, у першую чаргу, не праграмістаў ці сістэматэхнікаў, а паспяховых людзей...».

Апошні творчы конкурс «Маладая Беларусь», у якім канкурсанты спявалі і танцавалі, паставіў кропку ў «Студэнцкіх гульнях». Паўгадзінная паўза — і, нарэшце, аб'яўлены прызёры і новы ўладальнік тытула «Студэнт года». Трэцяе месца дасталося творчай натуры, будучаму мастаку-педагогу, студэнтцы Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Настассі Аўсейчык. Дзяўчына з'яўляецца актыўнай валанцёркай руху БРСМ «Добрае сэрца», удзельніцай дабрачыннага марафону «Усе фарбы жыцця для цябе», дабрачыннай акцыі ў дзіцячым сацыяльным прытулку «Працягні руку дапамогі» і іншых. Другое месца дасталося Міхаілу Карабіцкаму (Беларуска-Расійскі ўніверсітэт). А абсалютнай пераможцай стала **Марыя МАРЧУК — студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.**

Падчас цырымоніі ўзнагароджання начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля Пшанічная падкрэсліла, што вельмі важна, калі малады чалавек неабыякавы, калі ён хоча развівацца: «Кожны з нас у кожную хвіліну свайго жыцця робіць выбар: можна ленавацца, а можна працаваць. Можна паспаць, а можна пайсці на першую пару. Таму трэба прывучаць сябе да правільнага выбару...».

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by



Міхаіл Карабіцкі выбраў для творчага конкурсу «Маладая Беларусь» ваенную кампазіцыю.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

### ТРЫ ПЫТАННІ ДА ПЕРАМОЖЦЫ

***— Марыя, Новы год — гэта час падарункаў. Які з іх быў самы запамінальны ў тваім жыцці?***

— Мой дзень нараджэння блізкі да святкавання Новага года, і мне часта дораць сумешчаныя падарункі. Летась за некалькі дзён да майго дня нараджэння адзін з аднагрупнікаў выпадкова выпусціў мой ноўтбук, ды так... Карацей, пазбавілася я ноўта. Для праграміста гэта сапраўдная трагедыя! Нечаканай радасцю для мяне стала, калі сябры са студэнцкага савета майго факультэта скінуліся і падарылі мне новы! Гэта было бычцам у казцы. Я яшчэ доўга не верыла ў тое, што з мяне не пажартавалі, і не раскрывала падарунак, баючыся ўбачыць там толькі кардонную каробку.

***— Што папросіш у Дзеда Мароза на гэты раз?***

— Поспеху, здароўя, новых ідэй, і каб Год моладзі для мяне не скончыўся 31 снежня.

***— А якімі падзеямі ён запомніўся?***

— Другі раз у БДУІР прайшоў праект «Школа журналістаў». Мы з сябрамі са студэнцкага савета запусцілі праект «Сцэна», які ўяўляе з сябе тэатральную школу, арганізаваную па прынцыпе «студэнт навучае студэнта». Мой любімы факультэт — факультэт камп'ютарных сістэм і сетак — адзначыў юбілей. Наш факультэт, нарэшце, перамог у конкурсе «Студэнцкая вясна». І мяне ўзялі на працу!

# ЧЫМ ПАХНУЦЬ МЯХІ З ГРАШЫМА

## ДАСТАВІЦЬ У ЦЭЛАСЦІ І ЗАХАВАНАСЦІ

Ліцэнзія на інкасацыю ў краіне ёсць у васьмі банкаў. Прынцыпы працы інкасатараў усюды зводзяцца да аднаго — даставіць у цэласці і захаванасці грошы з аднаго пункта прызначэння ў іншы.

— Наш працоўны дзень пачынаецца з інструктажу. Ніводзін спецыяліст не выйдзе да машыны, пакуль не атрымае маршрутны ліст, не даведаецца ўсе апошнія «навіны банка» і не распішацца ў неабходных дакументах, — гаворыць Сяргей Смірноў, старшы інкасатар.

Звычайна ў брыгаду ўваходзяць тры-чатыры інкасатары. Чым больш патэнцыяльна небяспечная і людная тэрыторыя (напрыклад, вакзал або гандлёвы цэнтр), тым больш спецыялістаў патрэбна. Тады да інкасатараў і кіроўцы далучаецца ахоўнік. Працуюць брыгады па зменах: адны з раніцы і да дзевяці гадзін вечара, другія — з абеду і да поўначы.

— Кожны з нас выязджае на маршрут у бронекамізэльцы, з рацыяй і зброяй, — расказвае Артур. — Карыстацца апошняй можна толькі па інструкцыі: у выпадках відавочнага нападу на супрацоўнікаў з мэтай рабавання і пры пагрозе жыццю інкасатараў. Страляць на паражэнне без папярэджання забаронена. Мы ніколі не выкарыстоўваем пісталет або аўтамат у месцах масавага збору людзей.

Вага пісталета Макарава з зараджанымі абоймамі — амаль кілаграм, плюс аўтамат Калашнікава — тры, бронекамізэлька — пяць. Вось і атрымліваецца, што агульная вага амуніцыі інкасатара каля 10 кілаграмаў. Артур узгадаў, што гадоў сем таму адны толькі бронекамізэлькі важылі каля васьмі кілаграмаў.

— А як павінен паводзіць сябе інкасатар, калі да яго на вуліцы падыходзіць незнаёмец і пытаецца, напрыклад, як прайсці на тую ці іншую вуліцу або просіць цыгарэту? — пытаюся я.

— Мы не маем права ні з кім размаўляць пры перамяшчэнні з торбай з грашыма, адхіляцца ад строга вызначанага маршруту. Нават з міліцыяй кіроўца мае стасункі толькі праз перагаворную прылладу. Таму па цыгарэты лепш да нас не звяртацца — не дапаможам, — адказвае Сяргей.

Размаўляць падчас працы па мабільным тэлефоне інкасатарам нельга. Яго яны пакідаюць на базе.

— Жонка, зразумела, спачатку хвалявалася, калі трубку не браў, але з часам звыклася, — дадае Артур.

## ПРАЦА НЕ ДЛЯ ЖАНОЧЫХ РУК

— Не бачу ў вашым калектыве жанчын. Лічыце, што не справяцца з працай? — пытаюся ў сваіх суразмоўцаў.

— Справа не ў гэтым. Упэўнены, што ёсць жанчыны, якія выканаюць любую задачу на ўсе сто працэнтаў! — гаворыць Артур. — Тут трэба ўлічваць іншае. Інкасатар за змену цягае каля 50 мяшкоў і торбаў вагой ад 20 кілаграмаў. І несці іх прыходзіцца з машыны ў падвал або на другі-трэці паверх. Ці патрэбна жанчыне такая праца?

Цікава, што інкасацыйныя мяхі для грошай робяцца з вельмі трывалага брызенту, які практычна не гарыць і не прамакае. Аднак у гэтай надзейнасці ёсць і істотны мінус. Пры поўнай загрузцы мяшка яго вага дасягае 50 кілаграмаў, торбы — да 20-25.

Акрамя таго, ёсць яшчэ ёмістасць для захоўвання і перавозкі грошай — спецыяльныя касеты. Яны выкарыстоўваюцца пры абслугоўванні банкамата. Стан адсочваецца апаратамі, і калі выяўляецца, што ў якім-небудзь з іх заканчваюцца наяўныя грошы альбо ўзнікае нейкая тэхнічная няспраўнасць, — туды накіроўваецца брыгада інкасатараў і аператар. Ні першы, ні другі ў адзіночку адкрыць банкамат не могуць. Як жартуюць самі спецыялісты, гэта самая неразлучная «пара банка».



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

...патрэніравалася выхопліваць з кабуры табельную зброю...



...і прыводзіць яе ў баявы стан.

— Ці часта людзі незадаволеныя тым, што машыны інкасацыі ствараюць нязручнасці, стоячы на тратуарах або каля самых дзвярэй гандлёвых цэнтраў? — цікаўлюся я ў Ігара Сакалоўскага.

— Транспарт, які абслугоўвае аб'екты гандлю, мае права заязджаць на тратуар. Таксама спецтранспарту дазволена рухацца альбо стаяць там, дзе знакамі гэта забаронена. Акрамя гэтага, мы выконваем унутраную інструкцыю, згодна з якой машына павінна стаць як мага бліжэй да банка, крамы. Нельга несці грошы ў руках праз увесь горад!

Транспарт інкасатараў максімальна прыстасаваны для бяспечнай перавозкі грошай. Вокны не адчыняюцца, люк — толькі ў выпадку эвакуацыі. Машына важыць больш за тры тоны.

Спецыялісты банка кажуць, што праца інкасатара цяжкая больш эмацыйна, чым фізічна. Ім кожны дзень прыходзіцца насіць зброю і адказваць за вялікія сумы. А гэта асаблівая адказнасць. На мяхі грошай інкасатары глядзяць без якой-небудзь «цягі». (Маўляў, сантэхнікі ж не моляцца і не любуюцца на разводныя ключы!) На пытанне, ці пахнуць грошы, мужчыны, смеючыся, адказваюць, што адчуць можна толькі водар паперы і фарбы.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

*З базай у галаве*

# Ад Перуна да віртуальнай зацыркі

### У сталіцы прайшоў конкурс юных распрацоўшчыкаў відэагульняў

**Беларуская камп'ютарная гульня — даўно не аксюмаран, а звыклая справа. Айчынныя «айцішнікі» даволі паспяхова займаюцца распрацоўкай забаўляльных праграм, а славутая World of Tanks штогод ставіць усё новыя і новыя сусветныя рэкорды па колькасці гульцоў анлайн і іншых паказчыках. Трэба сказаць, што для цяперашніх распрацоўшчыкаў ужо падрастае змена — гэта пацвердзіў конкурс «Патрыёт.by», што прайшоў у Рэспубліканскім цэнтры інавацыйнай і тэхнічнай творчасці (РЦІТТ).**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Валерыя Касіла прадстаўляе ўвазе членаў журы праект «Беларускія прысмакі».

На конкурс з'ехаліся хлопцы і дзяўчаты ва ўзросце ад 12 да 21 года з усіх куткоў краіны. Пераможцаў вызначалі ў дзвюх намінацыях. У першай удзельнічалі камп'ютарныя гульні і творчыя праекты, прысвечаныя тэме барацьбы беларусаў падчас Вялікай Айчыннай вайны і подзвігам беларусаў пры вызваленні іншых краін. У другой — гульні і праекты на тэму нашай гісторыка-культурнай спадчыны, традыцый, дасягненняў беларусаў у розных сферах.

— Гэта ўжо пяты такі конкурс, — зазначыў на адкрыцці **дырэктар РЦІТТ Сяргей САЧКО**. — І прагрэс відавочны: узровень распрацовак павышаецца. Таму плануем, што ўжо ў наступным годзе конкурс стане больш маштабным, з'явяцца новыя намінацыі. Але галоўная тэматыка застанецца нязменнай — патрыятычная. Менавіта выхаваць у маладога пакалення пачуццё любові да сваёй краіны — наша галоўная задача.

Агляд праектаў праходзіў па дзвюх узроставых катэгорыях: 12-15 і 16-21 гады. Мы накіраваліся да самых маладых удзельнікаў.

Пераважная большасць распрацоўшчыкаў спынілася на фармаце камп'ютарнай вікторыны, бо ён не патрабуе прафесійных ведаў і параўнальна просты ў рэалізацыі. Але тэмы закранаюцца самыя розныя. Часцей за ўсё яны насілі лакальны характар — гісторыя і культура малой радзімы юных аўтараў. Напрыклад, вучаніца полацкай сярэдняй школы №6 стварыла віктарыну пад назвай «Полацкія лабірынты». Асновай для праекта паслужыла вядомая, пэўна, кожнаму, хто меў справу з камп'ютарам, праграма PowerPoint з пакета Microsoft Office. Гульня задае розныя кшталту пытанні па гісторыі і сучаснасці Полаччыны, а задача ўдзельнікаў — як мага хутчэй і правільней на іх адказаць. Пасля праграма вылічвае сумарны бал.

Марыя Самайловіч з Мінска выбрала больш буйны, рэспубліканскі маштаб і прадставіла гульню «Мая Беларусь». Гэта таксама віктарына, але па фармаце бліжэйшая да добра вядомай «Што? Дзе? Калі?», нават з такімі ж музычнымі паўзамі. Яшчэ адна перавага — наяўнасць відэапытанняў.

Вучань крупскай гімназіі Мікіта Рогаў стварыў гульню-квэст паводле славянскіх легендаў пад назвай «Археолаг». Згодна з аўтарскай задумай, атрад археолагаў даследуе старажытнасць і адначасова даведваецца пра такіх прадстаўнікоў беларускага пантэона, як Пярун, Сварог, Зюзя і іншыя.

Ілья Каралёнак з барысаўскай сярэдняй школы №9 вырашыў расказаць гульцам пра малавядомыя турыстычныя аб'екты на тэрыторыі Міншчыны — праект «Незвычайнае ў звычайным». Клікам па розных месцах карты можна знайсці інфармацыю пра такія цікавыя славутасці, як клецкі дуб і цудадзейная крыніца ў вёсцы Пакрашава, што на Случчыне...

Валерыя Касіла з дзятлаўскай гімназіі №1 стварыла праект «Беларускія прысмакі», прысвечаны традыцыйнай кухні. У некаторых заданнях, напрыклад, трэба было адасобіць першыя стравы ад другіх, дапоўніць няскончаныя прыказкі, суаднесці стравы і святы, на якія яны падаваліся.

— На жаль, цяпер не ўсе ведаюць, чым харчаваліся нашы продкі, — дзеліцца меркаваннем аўтарка «Беларускіх прысмакаў». — Мне падалося, што такі праект можа выправіць сітуацыю. Дарэчы, сама я вельмі люблю нашы стравы, асабліва бабуліны дранікі і зацірку.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
lyskavets@zviazda.by

*Ведай нашых!*

# ПРАБІЦЦА З «ГРУПЫ СМЕРЦІ»

**...у фінал чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў ACM ICPC здолелі дзве беларускія каманды.**

Усяго ў паўфінальных спаборніцтвах Паўночна-Усходняга Еўрапейскага рэгіёна ўдзельнічалі каля 230 камандаў з Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Казахстана, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Кыргызстана, Туркменістана і Узбекістана, якія змагаліся за 12 пуцёвак у заключную частку спаборніцтваў. Менавіта гэты паўфінал называюць «групай смерці», таму што ў ім выступаюць самыя моцныя студэнцкія каманды праграмістаў, у тым ліку і неадназаразовыя абсалютныя пераможцы чэмпіянату свету — студэнты Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта ITMO.

Спаборніцтвы праводзіліся адначасова ў рэжыме рэальнага часу ў Санкт-Пецярбургу, Барнауле, Ташкенце і Тбілісі з агульнай табліцай вынікаў. Згодна з правіламі, у фінал можа прайсці ад універсітэта толькі адна каманда, якая паказала найлепшы вынік. Таму канкуруюць паміж сабой у тым ліку і студэнты адной ВНУ. Беларусь у Санкт-Пецярбургу прадставілі 10 камандаў: ад БДУ выступалі чатыры каманды, тры каманды — ад БДУІР і па адной — ад Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта і Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы.

Па выніках паўфіналу каманда студэнтаў факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Belarusian SUIR #2 у складзе Андрэя Воўчака, Андрэя Собаля і Аляксея Вісцяжа заваявала права прадстаўляць Беларусь у фінале самых прэстыжных спаборніцтваў па праграмаванні. Хлопцы рашылі 9 задач, занялі 7-е абсалютнае месца, атрымалі дыплом першай ступені, а з ім і выхад у фінал. У Тайландзе выступіць яшчэ адна беларуская каманда — студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. За яе выступаюць Канстанцін Сокал, Аляксей Паліеевец і Павел Шафцялевіч. Каманда Белдзяржуніверсітэта заваявала ў паўфінале дыплом 2-й ступені. На яе рахунку 8 рашаных задач з 12 прапанаваных.

Па выніках спаборніцтваў у фінал прабіліся 10 камандаў ад расійскіх ВНУ і дзве — ад беларускіх.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*




Каманда БДУІР — у фінале чэмпіяната свету.

# ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 21.01.2016 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Серпищено, участок № 1, кадастровый номер 623288014101000036 | 0,1958 га | Подъездные пути удовлетворительные | 23 866 300 | 4 773 300 | 5 193 100 |
| 2 | д. Бориски, участок № 5, кадастровый номер 623288002101000015 | 0,2500 га | Подъездные пути удовлетворительные | 25 870 000 | 5 174 000 | 5 193 100 |
| 3 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, д. 15 «А», кадастровый номер 623288001601000092 | 0,1369 га | Подъездные пути удовлетворительные | 21 589 800 | 4 318 000 | 13 569 600 |

*Задаток перечисляется на р/счет № 3600619171100 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк» МФО 153001601, УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Аукцион состоится **21.01.2016 г. в 10.00** по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются **до 16.01.2016 г.** (последний день подачи заявления **15.01.2016 г. до 17.00**) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Контактные телефоны: (**8 01774) 57 4 35, 57 4 99.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАГОТОВКИ И (ИЛИ) ЗАКУПКИ ВИНОГРАДНОЙ УЛИТКИ

| Территория, на которой предоставляется право на заготовку и (или) закупку | Предмет аукциона | Условия заготовки и (или) закупки | Цена предмета торгов (аукциона) (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| Мядельский район | право на заготовку и (или) закупку виноградной улитки сроком на 5 лет в объемах более 10000 кг | предельно допустимый объем изъятия виноградной улитки – 20000 кг в календарном году | 9 000 000 | 1 800 000 |

1. **Аукцион состоится 22 января 2016 года в 11 часов в здании Мядельского райисполкома по адресу: г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 20.**

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Участнику необходимо подать соответствующее заявление в Мядельский райисполком и заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

*Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3600623001906 в филиале № 601 г. Молодечно ОАО «АСБ Беларусбанк», код 769. Получатель – Главное управление МФ РБ по Минской области, УНП 600537220, код платежа 05520.*

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Мядель, пл. Ленина, 1, кабинет 21, последний день приема документов **18 января 2016 года.** Заключительная регистрация участников **22 января 2016 года с 10.00 до 10.50.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

В аукционе могут принимать участие представители юридического лица или индивидуального предпринимателя при условии представления надлежаще оформленной доверенности и предъявления паспорта или иного документа, удостоверяющего личность.

Шаг аукциона в размере 5 процентов от предыдущей цены.

4. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, если ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер.

Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, право на заготовку (или) закупку предоставляется данному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы по публикации объявлений об аукционе в средствах массовой информации.

5. Контактный телефон (8 01797) 55536.

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гомельский радиозавод», 8(0232)21 60 07

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166989, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9/41, площадь – 296,0 кв.м, назначение – Здание неустановленного назначения, наименование – Здание неустановленного назначения, - Забор (железобетонные плиты на бетонных столбах) длиной 112 м, - Мощение асфальтобетонное на щебеночном основании. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000005005687 площадью 27,9350 га | 119 241 300 | 17 886 100 |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 28 декабря 2015 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 17⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **30 декабря 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс) и на сайте www.bti.by**

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОАО «СтанкоГомель» 8(0232)75-71-11

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение с инв. №350/С-111683 (здание склада упаковщиков), общей площадью 164,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. №350/С-111643 (ремонтно-строительного и модельного цеха), общей площадью 1202,0 кв.м (составные части и принадлежности: пять пристроек и металлический навес), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. №350/С-111641 (пилорама), общей площадью 82,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-78236 (склад ГСМ), общей площадью 72,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111637 (склад цемента), общей площадью 263,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111636 (склады), общей площадью 73,3 кв.м (составные части и принадлежности: три кирпичные пристройки), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111639 (склад лакокрасок), общей площадью 266,7 кв.м (составные части и принадлежности: навес, металлические ворота, ж/б забор, кирпичный забор, ж/б забор, кирпичный забор, асфальтовое покрытие площадью 3976,0 кв.м), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10/17. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111638 (весовая), общей площадью 80,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-166018 (здание склада огнеупоров), общей площадью 190,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. – Капитальное строение с инв. № 350/С-111642 (мойка автомашин), общей площадью 7,3 кв.м (составные части и принадлежности: эстакада с ёмкостями для сбора и отстоя сточных вод), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 10/23. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000001005894 площадью 0,8294 га. | 10 043 964 000 | 1 004 396 400 |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 28 декабря 2015 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 17⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **30 декабря 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.

9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением Филиала «Центр «Белтехинвентаризация».

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс) и на сайте www.bti.by**

***Уважаемые акционеры ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»!***

**Во Дворце культуры сахарорафинадного комбината по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко, 6, 20 января 2016 года в 16.00**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**открытого акционерного общества**

## «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»

ПОВЕСТКА ДНЯ:

**«О даче принципиального согласия на реорганизацию ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» путем присоединения к нему ОАО «Преснаки» и ОАО «Суворова-Агро» Копыльского района».**

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составляется на 01.11.2015 года.

Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания с 15.00 до 16.00 по месту его проведения.

Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам – паспорт.

Информацию (материалы) по вопросам повестки дня можно получить:

- в рабочие дни – с 8.00 до 17.00 по месту нахождения Общества (ул. Головащенко, 6) начиная с 12 по 19 января 2016 года (тел. 8017-95-4-53-28);
- в день проведения собрания – по месту его проведения.

*Дирекция, Наблюдательный Совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».*

УНП 600075003

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 400/С-12047 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание), площадью 124,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422086505101001109 (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного здания), площадью 0,0324, расположенном по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2 |
| **Начальная цена продажи** | 409 510 000 (четыреста девять миллионов пятьсот десять тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 40 951 000 (сорок миллионов девятьсот пятьдесят одна тысяча) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 28 декабря 2015 г. в 16.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.10.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 22 декабря 2015 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

*Друкуецца ў «Маладосці»*



**Снежань — ці не той час, калі многія з нас чакаюць чагосьці неверагоднага? Для тых, хто верыць у цуды і тым, хто даўно зняверыўся, «казачны» нумар часопіса «Маладосць» прапануе абсалютна рэалістычнае апавяданне Настассі Нарэйкі «Сукенка для прынцэсы», у якім аўтарка сцвярджае, што і ў нашым з вамі жыцці ёсць месца для казкі.**

**Настасся НАРЭЙКА**

# СУКЕНКА ДЛЯ ПРЫНЦЭСЫ

Яна заседзелася над рукапісам да глыбокай ночы. Калі зірнула на гадзіннік, ажно спужалася. Час спяшаўся. І ёй трэба было спяшацца таксама, трэба было завяршаць пераклад, які ўжо тры дні чакалі ў выдавецтве.

Нямецкія словы, надрукаваныя ў кнізе вострым, як гатычныя шпілі касцёла ў Кёльне, шрыфтам, літаральна рэзалі ёй вочы, губляючы ўсялякі сэнс. Ад стомы яна ўжо не магла звязаць гэтыя словы з пэўнымі паняццямі. Тэкст рассыпаўся на асобныя літаркі...

Яна пацерла вочы рукамі і, паставіўшы локці на тоўсты слоўнік, сціснула скроні тонкімі белымі пальцамі.

Трэба скончыць... Трэба... Яшчэ дзесяць старонак... Мала...

— Многа! — абурыўся голас недзе ўсярэдзіне, але яна не звярнула на яго ўвагі.

Стома не мела значэння. Нішто не мела значэння, акрамя Леры.

Думка пра дачку прымусіла Яну падняцца з-за стала, заваленага паперамі, і на дыбачках прайсці да фіранкі, за якой хаваўся невялікі ложак. Лера спала. Вочы былі заплюшчаны, але, нават не гледзячы ў іх, маці ведала, што глыбокі сіні колер ім падарыла не рака, не возера, не мора, а сам акіян. Юравы вочы. Юравы кучаравыя валасы. Усё ад яго і нічога ад яе. Але гэта справядліва. Няхай. Хоць нешта застанецца ў дзяўчынкі ад бацькі...

Асцярожна завесіўшы фіранку, яна вярнулася за стол і, каб хоць крыху адпачыць ад работы, дастала з шуфляды ліст, адрасаваны Лерай Дзеду Марозу. Яна абяцала кінуць яго ў паштовую скрынку, каб запісанае няўпэўненым пакуль почыркам другакласніцы запаветнае жаданне спраўдзілася.

«Добры дзядулька, — пісала Лера. — Сёлета зноў спяшаюся павіншаваць цябе з Новым годам.

Я ўжо вялікая дзяўчынка і таму не буду прасіць у цябе таго, што прасіла летась. Я ведаю, што ты не можаш вярнуць мне татку. Гэта занадта вялікі цуд. Ён залежыць не ад цябе. *(Дачытаўшы да гэтага месца, Яна заўсёды спынялася, каб выцерці слёзы.)*

Дзядуля Мароз!

Падары, калі ласка, маёй маме добры настрой і светлую ўсмешку. Зрабі так, каб яна не плакала. Я буду старанна вучыцца, прыбіраць у нашым пакоі. Абяцаю! Толькі супакой маму. Дзякуй.

Твая Лера».

Дачка нічога не прасіла для сябе. Хоць даўно марыла аб прыгожай сукенцы, што вісела ў вітрыне вялікай крамы. «Убор для прынцэсы» — так Лера называла яе, калі падчас прагулкі яны спыняліся перад празрыстым шклом. Сукенка каштавала дорага, і маці вырашыла, што абавязкова падорыць яе сваёй маленькай прынцэсе на Новы год, нават калі давядзецца ўзяць лішнюю работу дадому. Свята мелася надысці праз тры дні.

Яна павольна правальвалася ў сон і, напэўна, здалася б на літасць яму, калі б настольная лямпа не хліпнула раз, другі... «Лямпачка перагарае», — падумала жанчына і, страсянуўшы цяжкай ад думак галавою, перагарнула старонку. Заставалася яшчэ дзесяць...

Ён спяшаўся. Ён заўсёды спяшаўся і ніколі нічога не паспяваў. На лесвіцах свайго офіса штурхаў калег на хаду і не думаў нават прасіць прабачэння. Седзячы за рулём моднай машыны, ехаў як на злом галавы, абдаваў пешаходаў сумессю мокрага снегу з гразզю і не заўважаў гэтага.

Дома Юра ніколі не размаўляў з жонкаю і сынам-першакласнікам, кожны дзень соваў ім новыя хрумсткія купюры, нібыта адкупляўся ад размоў. У яго было два сябры — тэлевізар і камп'ютар.

Юра кіраваў сваёй невялікай фірмай, якую адкрыў дзякуючы сродкам жонкі, што склалі стартавы капітал. Не лічыўся падчас работы ні з чым, акрамя сваіх інтарэсаў. Ды і ўвогуле, яго мала што цікавіла ў жыцці. Нават набліжэнне навагодніх свят ён заўважаў толькі тады, калі наступіў босай нагою на ёлачны шарык, які апынуўся на падлозе стараннямі гарэзлівага ката Марціна.

Новы год. Гэтыя два словы не асацыяваліся для яго ні з чым — так... Яшчэ адна нагода тыцнуць родзічам грошы, якія перасталі быць для яго мэтай жыцця, як некалі. Юра не ведаў, на што іх траціць. Цяпер не ведаў. Здаралася, ён нават сумаваў па тым часе, калі жыў на дзве сям'і, «рыхтаваў глебу для сыходу ад Яны і шасцімесячнай дачкі да багатай спадчынніцы Ульяны, якая вось-вось збіралася нарадзіць яму сына». Так ён казаў «сябрам», з якімі без шкадавання развітаўся адразу ж, як толькі пачаў багацець.

Вось і сёння, адмовіўшыся ад вячэры і шчыльна зачыніўшы дзверы пакоя, адведзенага пад «кабінет», Юра сеў за камп'ютар. На рабочым стале адразу ж кінуўся ў вочы новы дакумент пад дзіўнаю назваю «Ліст Дзеду Марозу». Ён хацеў спярша адправіць яго ў віртуальную смеціцу, але потым вырашыў прачытаць. Пісаў, вядома ж, сын...

«Добры дзень Вам, паважаны Дзед Мароз!

Прызнаюся, што першы раз у жыцці пішу Вам пісьмо. Я даўно ведаю, што Вы — проста прыдумка для маленькіх дзяцей, але сёння я звяртаюся менавіта да Вас. Я не ведаю, хто яшчэ можа дапамагчы мне. Нездарма ж тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак па ўсім свеце пішуць Вам.

Я прашу, вярніце мне, калі ласка, майго тату. Ён жыве з намі. Вы нічога дрэннага не падумайце. Але яго быццам няма. Калі ласка...»

Ліст быў не дапісаны. Юра прабег яго вачыма яшчэ раз, а потым сярод двух варыянтаў, прапанаваных паслужлівым камп'ютарам, выбраў «не захоўваць»...

За тыдзень да Новага года Генка даведаўся, што ў яго ёсць сястра. Аказваецца, так бывае. Мамы ў іх розныя, а тата адзін.

Ён ведаў, што сястру завуць Лерай, што вочы ў яе сінія, а валасы каштанавыя, як у яго самога. Гэта пацвярджаў фотаздымак, што выпаў з кішэні татавага паліто, якое мама дастала з верхняй паліцы шафы. За ім стаяла скрынка з ёлачнымі цацкамі. Дзяўчынка на фота ўсміхалася, але ў тварыку яе было нешта такое сумнае, што ў яго сціснулася сэрца.

На наступны дзень мама з Генкам пайшлі ў вялікую краму ў цэнтры горада — хацелі купіць чырвоную зорку для ёлкі. І тут ля вітрыны хлопчык убачыў... сваю сястру! Мама цягнула яго за руку, але Генка паспеў заўважыць, з якім захапленнем і сумам адначасова пазірала Лера на прыгожую ружовую сукенку за шклом. А жанчына побач з ёю (відаць, маці) ледзь стрымлівала слёзы. Генка адразу пра ўсё здагадаўся. Ён быў разумны хлопчык.

Яна ляцела дадому як на крылах. У яе сумачцы ляжала тое, без чаго яна не магла выканаць запаветнае жаданне Леры. Як гэта своечасова! Асабліва сёння — 31 снежня.

— Збірайся, дачушка!

Дзяўчынку не трэба было ўгаворваць. У глыбіні душы Лера ведала, куды вядзе яе заснежанымі вуліцамі мама, і не магла адважыцца паверыць.

Хутчэй! Хутчэй!

Іх, здавалася, прыспешваў нават вецер, забыўшыся на хвіліну пра асноўны свой абавязак — кружыць у паветры сняжынкі-выцінанкі...

Радасць рассыпалася тысячамі асколкаў, нібы злое люстэрка Снежнай каралевы, калі яны спыніліся перад вітрынай. Вочы не верылі. Сэрцы на імгненне перасталі біцца. Сукенкі не было... Як?!

Маці і дачка павольна павярнуліся спінамі да халоднага шкла і, як сляпыя, пабрылі дадому. Прыступкі лесвіцы здаваліся бясконцымі, хоць кватэра іх была на другім паверсе.

— Мама, — Лера зазірнула ў любімыя вочы, поўныя слёз. — Бог з ёю, з сукенкай. Праўда!

— Праўда... — паўтарыла Яна.

Генка літаральна дыхаць перастаў ад хвалявання, калі пачуў унізе ў пад'ездзе доўгачаканыя крокі. Гэта яны! Ён пайшоў насустрач і... адхіснуўся, калі ўбачыў, якія ў іх твары. Дзяўчынка заўважыла яго першай.

— Лера... — прашаптаў імя Генка і замаўчаў, шукаючы словы і не знаходзячы іх. Рукі яго дрыжалі. І вялікая белая скрынка пачала павольна выслізгваць з іх, пакуль не апынулася на падлозе.

— Асцярожней!

Усе адначасова схіліліся над скрынкай, пад накрыўкай якой пералівалася ўсімі адценнямі ружовага сукенка для прынцэсы...

*Кароткім метрам*

# Калі цябе пакінулі ў спакоі. Назаўсёды...

**Што будзе, калі ты застанешся адзін на зямлі? Такім пытаннем задалася маладая каманда Pirate studio, якая зняла кароткаметражку пра чалавека, чыё жыццё залежыць ад учыненай выпадковасці і... веры. Пра гэтката Рабінзона Круза на беларускі манер. Каманда стала ўдзельніцай праграмы падтрымкі маладых кінематаграфістаў — праекта KINOSPRINT, арганізатарамі якога выступілі «Майстэрня сацыяльнага кіно» і экалагічнае таварыства «Зялёная сетка», гатовыя даць маладым аўтарам прафесійную кансультацыйную падтрымку і патрэбную тэхніку. Удзельнікам трэба было прайсці некалькі этапаў адбору, у тым ліку абараніць на двух пітчынгах (прэзентацыях з мэтай пошуку інвестараў) свае ідэі і кінапраекты і — пры ўмове перамогі — правільна скарыстацца прадастаўленай магчымасцю. Пераможцаў у выніку засталося тры — «Лічыльнік шчасця», «Эстафета» і той самы праект групы Pirate studio «Дваццацьшаснаццаць».**

— Сцэнарый напісаў таленавіты драматург, артыст маладзёжнага тэатра Дзмітрый Багаслаўскі, — гаворыць **прадзюсар карціны Надзея ІЛЬКЕВІЧ***. — Гэта фільм аднаго акцёра, які распавядае пра жыццё чалавека ва ўмовах пост-апакаліпсісу. Знаходзячыся ў поўнай ізаляцыі ён не губляе галоўнае — надзею. Паказваецца яго побыт, перажыванні і дарэмныя спробы знайсці кагосьці з жывых. Герой нібы балансуе паміж верай у лепшае і вар'яцтвам. За ўвесь час ён прамаўляе ўсяго адну фразу, але фільм ад гэтага нічога не страчвае. Мы хацелі паказаць, што такая гісторыя магла адбыцца абсалютна з кожным з нас, у любой краіне. Напрыканцы герой знаходзіць паштоўку з выявай начнога мегаполіса і вырашае пабудаваць новы горад.

Здымкі праходзілі за трыццаць пяць кіламетраў ад Мінска каля вёскі Наваполле. Па ўмовах конкурсу, на ўсё пра ўсё адводзілася тры дні. Першы дзень амаль прапаў з-за залевы, таму група была вымушана прасіць у арганізатараў дадатковы час. Змены доўжыліся 14—16 гадзін, але гэта таго было варта, кажа суразмоўца. Дарэчы, падчас працы адбывалася ў поўным сэнсе нешта незвычайнае. «У першы здымачны дзень, калі мы везлі цяжкавагавы рэквізіт, адна з машын зламалася, не даехаўшы ўсяго пару кіламетраў да рабочай пляцоўкі. Па дарозе дадому той жа лёс спасціг мікрааўтобус, чатыры легкавыя машыны і адну грузавую. На другі дзень мы пакінулі канструкцыю для здымак на ноч, а калі зранку прыехалі, убачылі, што нехта вынес частку рэквізіту».

— Наогул, здымкі фільма, нават кароткаметражкі, — задавальненне не з самых танных. Пракат адной камеры каштуе каля чатырохсот долараў у суткі. Калі б мы працавалі на камерцыйнай аснове, з выплатай усіх ганарараў, арэндай усёй тэхнікі і транспарту, то гэты фільм каштаваў бы больш за трыццаць тысяч долараў, — дзеліцца Надзея Ількевіч. —. Здымаючы малабюджэтнае кіно, мы навучыліся ствараць «дым-машыну» з восеньскага лісця, будаваць з дапамогай творчай каманды дэкарацыі з жалезных бочак, пакрышак, тэлевізара і дошак. Большая частка групы — акцёры розных беларускіх тэатраў. У пастаноўцы нам таксама дапамаглі студэнты ўніверсітэта культуры і Інстытута сучасных ведаў.

**Герой нібы балансуе паміж верай у лепшае і вар'яцтвам. За ўвесь час ён прамаўляе ўсяго адну фразу, але фільм ад гэтага нічога не страчвае.**



Фільм здымалі ў чыстым полі.

Прэм'ера фільма запланавана на сярэдзіну студзеня наступнага года.

**Алена ЯКАВЕНКА, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

* Надзея Ількевіч — дырэктар культурна-асветніцкай установы «Цэнтр культурнага менеджменту», адна з арганізатараў «Ночы музеяў-2013, 2014»; кіраўнік праекта па гарадскім развіцці «Школа супергерояў/Крэатыўны горад».

SEX=БАЛЯСЫ

# Не спяшайся, бо паспееш

**...Мой стрыечны брат вярнуўся з арміі з цвёрдым намерам «адцягнуцца». Хлапчуковыя кампаніі, дыскатэкі, прыгоды... І праз паўгода... ажаніўся. Як той казаў, знайшоў тыя самыя прыгоды на адно месца, якое ніжэй спіны. («Ты як са сваёй жонкай пазнаёміўся? — Ды выпадкова ў кавярні сустрэліся вачыма. Яна ўсміхнулася і сказала: «Цяпер ты будзеш маім хлопцам!» — А ты што?» — А я курыў шмат. Праз два кварталы выдыхнуўся, яна і дагнала...») Справа ў тым, што з-за гэтай паспешлівасці і з-за таго, што абранніца была крыху старэйшай за брата, у маладой сям'і па першым часе не ўсё гладка складвалася з бацькамі маладога, з якімі яны мусілі жыць пад адным дахам... А што да пошуку прыгод увогуле, дык гэтым часам грашаць нават добрапрыстойныя члены нашага грамадства. Памятаеце, як казала Людміла Пракоф'еўна Калугіна са «Службовага рамана»: «У мяне такая бездакорная рэпутацыя, што мяне ўжо даўно пара скампраметаваць»? У некага тое атрымліваецца ад выпадку да выпадку, у іншых — сістэмны падыход. («Выхадныя», — закрычаў мозг і панёс «пятую кропку» ў невядомым кірунку»).**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Я неяк згадваў гісторыю, калі на стары Новы год дзяўчаты варажылі паваражыць. Адна дастала з шапкі паперку са словамі «Не спяшайся, бо паспееш». І тым жа вечарам, вяртаючыся дадому, паленавалася ісці да пешаходнага пераходу. Пашыбавала напрасткі... да машыны дзяржаўтаінспектараў, якая стаяла на процілеглым баку вуліцы... Вось яшчэ два свежыя выпадкі, калі людзі літаральна шукалі прыгод. У сталіцы жанчына нападзiтку так хацела без грошай праехацца на таксі, што ў выніку аголеная палезла на капот машыны, пашкодзіўшы напачатку яе, а потым і другую. А ў гандлёвым цэнтры маладая парачка распранулася на вачах прадаўцоў і наведвальнікаў. Сведкі кажуць, што хлопец і дзяўчына выглядалі адэкватна. Можа, прайгралі ў спрэчы? Як бы там ні было, маладых людзей вышукваюць, і, калі знойдуць, ім давядзецца адказваць за свой «стрыптыз».

Дарэчы, мне нядаўна расказалі гісторыю, як адна кампанія правяла хлапечнік. Віноўнік урачыстасці — уладальнік бара — катэгарычна адмаўляўся падтрымліваць тосты сваіх сяброў. А прачнуўся (прабачце, з песні слоў не выкінеш) у прыбіральні ўласнай установы з вялікім сіняком пад вокам. Прычым абставіны яго з'яўлення ў гэтым месцы так і засталіся невядомымі. («Закадзіраваны муж на карачках прыпаўзае дадому: «Жонка, выклікай міліцыю!» — Што здарылася? — Мяне ўзламалі!») Уяўляеце, у чалавека праз тыдзень вяселле, а вока заплыло... Балазе, абранніца аказалася мудрай жанчынай, даравала. (Відаць, ведае анекдот пра тое, што «пярсцёнкі на даху вясельнай машыны азначаюць, што пачатковы лік — 0:0») А што ж удзельнікі хлапечніку? Яны вырашылі, што ва ўсім вінаватая... стрыптызёрка, якую сябры выклікалі для віноўніка святавання. Па водгуках, дзяўчына адпрацавала «на ўсё сто»: перацанцавала з кожным госцем, нацёршыся соллю і частуючы ўсіх па чарзе тэкілай... («Мама, мяне хлопец пагуляць запрасіў — Не хадзі! — Чаму? — Не ламай чалавеку жыццё!»)

**Пасадзіў бы таго «салдата Джэйн» на ўтульную канапу, уважліва паслухаў яе жаночую гісторыю, а потым сказаў бы: «Проста мужыка ў цябе нармальнага не было». І ўсё.**

А гэтыя дзве навіны прыйшлі нядаўна з Амерыкі амаль адначасова і абедзве, як ні дзіўна, датычаць тых самых пошукаў прыгод на адно месца. У Кембрыджскім універсітэце прайшоў штогадовы конкурс на самыя лепшыя... ягадзіцы. Фіналістамі спаборніцтва сталі пяць студэнтаў і пяць студэнтак. Удзельнікі павінны былі прадставіць свае фотаздымкі ў аголеным выглядзе або ў ніжняй бялізне. Дык вось, дзевяць з дзесяці фіналістаў аддалі перавагу менавіта жанру «ню». («У адных галоўныя паўшар'і абароненыя чэрапам, у другіх — штанамі, а ў трэціх — бюстгальтарам.») Калі тут чаму і здзіўляцца, дык хіба месцу правядзення незвычайнага конкурсу. Вось пра што б ніколі не падумаў, дык гэта пра тое, чым славіцца зараз Кембрыдж — навукай з «арэшкамі»...

А вось іншая навіна, на мой погляд, сумная. Міністэрства абароны ЗША абвясціла аб знянці ўсіх абмежаванняў, звязаных са службай жанчын у арміі. Цяпер ім будзе дазволена кіраваць танкамі, страляць з мінамётаў і весці пяхоту ў бой. Хоць працаўнікі такога рашэння прыводзілі даныя навуковых даследаванняў: падраздзяленні, дзе служаць прадстаўнікі абодвух палоў, выконваюць заданні горш, чым выключна мужчынскія... Я з павагай стаўлюся да жанчын-ваенных, але пагадзіцеся, ёсць нешта ненармальнае ў тым, калі прыгожаму полу давядзецца падымаць байцоў у атаку недзе ў «гарачай кропцы». Вось гэта і ёсць тыя самыя прыгоды на «пятую кропку». «Нашы ваенныя змогуць выкарыстоўваць навыкі і магчымасці таленавітых жанчын», — заявіў кіраўнік Пентагона. Як яны іх збіраюцца выкарыстоўваць, калі жанчына прызначана для іншага? А пагаварыў бы з якой афіцэркай дэсантніцай, якая спрабавала б нешта кшталту: «Як справы на асабістым фронце?» — «Пакуль што толькі ўрукапашную...» Вось пасля гэтага пасадзіў бы таго «салдата Джэйн» на ўтульную канапу, уважліва паслухаў яе жаночую гісторыю, а потым сказаў бы: «Проста мужыка ў цябе пушку нармальнага не было». І ўсё. А пасля кіраўнік Пентагона павінен быў бы дадаць: «Ну, ідзі дадому. І не спяшайся, бо паспееш».

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «...УСЁ АСТАТНЯЕ ПЕРАСТАЕ ІСНАВАЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



***— Музыкай вы займаецеся не першы год. Ці дапамагае яна перажываць, напрыклад, нейкія змены, расчараванні ў жыцці па-за сцэнай?***

— Свой занятак я не ўспрымаю як працу, бо музыка для мяне — стыль жыцця. Паглыбляючыся ў творчы працэс, мне ўдаецца абстрагавацца ад непрыемнасцяў, суму. Калі я спяваю (прычым не важна, у студыі ці на сцэне), то ўсё астатняе ў гэты момант перастае існаваць. Перад канцэртам мне абавязкова трэба прыйсці на сцэну, каб «павітацца і пазнаёміцца» з месцам будучага выступлення. Адчуць яе энергетыку. А пасля канцэрта, калі ўсе ўжо разыходзяцца, я вяртаюся ў глядзельную залу і разумею, што я не самотная.

***— Як настройваецеся на выступленні?***

— Гэта вельмі важны момант. Трэба, каб перад канцэртам мяне ніхто не чапаў. Калі, напрыклад, хтосьці дакучае з размовамі, то я проста сыходжу. Бо мне патрэбна паразважаць аб тым, пра што буду размаўляць з гледачом. Ёсць і пэўныя асабістыя сакрэты, але імі па-куль не дзялюся.

***— Настрой на канцэрце залежыць ад рэакцыі публікі?***

— Аўдыторыя бывае рознай, гэта праўда. Але я заўсёды знаходжу ў глядзельнай зале вочы чалавека, які чуе і разумее мяне, маю музыку. І, нават заўважаючы абыякавасць кагосьці з прысутных, я не засмучаюся, бо ведаю пра тых, хто са мной на адной хвалі. А калі шчыра імкнешся іншым аддаваць сваю энергетыку, эмоцыі, то і табе вяртаецца тое ж самае.

**«Паглыбляючыся ў творчы працэс, мне ўдаецца абстрагавацца ад непрыемнасцяў, суму».**

***— Вы ўжо знайшлі свой стыль?***

— Творчыя пошукі ў мяне доўжацца даўно. Давялося прымераць розныя вобразы, маскі. Цяпер я выступаю з жывым бэндам і разумею, што хачу рабіць акцэнт менавіта на аўтарскія песні, бо толькі так замужу быць самой сабой.

***— Я бачу, вы змянілі колер валасоў...***

— Не магу сказаць, быццам гатовая на любыя эксперыменты з вобразам, але перафарбаваць валасы мне параіў стыліст Віталь Мазоль, і я да яго прыслухалася. Мой натуральны колер русы, таму цяпер адчуваю сябе гарманічна, вярнуўшыся да яго. Хоць, безумоўна, хапала эксперыментаў: была і брунеткай, і рыжай...

***— А ці апраўдвае сябе ваш ход спалучаць музыку і элементы тэатра на канцэртах?***

— Думаю, з часам зразумеем дакладна, ці запатрабаваная ў такім выглядзе падача музычнага матэрыялу. На тых канцэртах, што ўжо прайшлі, народу было шмат. Але нам хацелася б бачыць, што аўдыторыя расце.




***— У нумары, з якім вы спрабавалі сябе на сёлетнім адборы на конкурс «Еўрабачанне», вобраз спявачкі-міма глядзеўся цікава...***

— Я не магу сказаць, быццам вельмі сур'ёзна стаўлюся да гэтага конкурсу, але вынікі мяне хвалявалі. Артысты ж рыхтуюцца, працуюць над песняй, вобразамі. Зразумела, хочацца прайсці далей. Мы не ў фінале, але гэта не страшна. Запішам сваю кампазіцыю ў студыі, а на наступны год — хто ведае — можа, зноў паспрабуем свае сілы. Якім бы ні быў вынік, выснова адна — працаваць над сабой і імкнуцца да ўдасканалення.

**«Я заўсёды знаходжу ў глядзельнай зале вочы чалавека, які чуе і разумее мяне, маю музыку».**

***— Выдатны бонус прафесіі артыста — гэта магчымасць вандраваць. Дзе ўжо пабывалі і куды яшчэ хочацца завітаць з канцэртамі?***

— Я не магу сядзець на адным месцы, таму паездкі для мяне — невераготнае задавальненне. Мне хочацца знаёміцца з новымі людзьмі, спяваць для іх. Сёлета мы пабывалі з канцэртамі пакуль што толькі ў Беларусі і Расіі. Скажу шчыра, пасля іх мне захацелася працаваць. Нават пачала песні пісаць на англійскай мове, каб у будучыні можна было пашыраць гастрольную геаграфію. Увогуле мару праехацца аднойчы з канцэртамі па ўсім свеце.

***— Ці верыце вы ў цуды і як збіраецеся адзначаць Новы год і Каляды?***

— Я веру ў чараўніцтва і неаднойчы мела магчымасць пераканацца ў яго існаванні. Самае галоўнае — не забываць, што цуды мы здольны ствараць самі, сваімі рукамі. На Новы год буду дзяліцца добрым настроем з рознымі людзьмі, радаваць іх сваімі песнямі. А Каляды сустрэну са сваёй сям'ёй, бо для мяне гэта вельмі важнае свята, якое збірае ўсіх блізкіх людзей разам.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

**Будзем разам у 2016-м!**

**Чытайце ў наступным годзе на старонках «Чырвонкі. Чырвонай змены»:**

*— пра задумы і справы маладзёжнай арганізацыі БРСМ;*
*— як выбраць будучую прафесію — парады спецыялістаў;*
*— пра студэнцкае жыццё-быццё: не вучобай адзінай;*
*— аповеды маладых спецыялістаў пра першыя працоўныя месяцы;*
*— інтэрв'ю з прадстаўнікамі айчыннага шоу-бізнесу;*
*— «пробы пяра» маладых і юных няштатных аўтараў у творчым конкурсе «Я — малады. І мне не ўсё роўна!»;*
*— пра вандроўкі, захапленні і яшчэ шмат чаго цікавага!*

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ! БУДЗЕ ЦІКАВА!**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.035.
Нумар падпісаны ў 19.30 16.12.2015 г.

## Извещение о проведении повторного аукциона по продаже ранее используемого оборудования, принадлежащего ЗАО «Завод технических масел», расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Чаусы, ул. Производственная, 1А-2

| № лота | Наименование основного средства | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Минимальная цена с НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Агрегат ВКС 4/28А | 1920000 | 38400 | 3900 |
| 2 | Агрегат НМШ 5-25-4,0/10 | 2580000 | 51600 | 5200 |
| 3 | Агрегат НМШ 8-25-6,3/2,5 | 2040000 | 40800 | 4100 |
| 4 | Каплеотделитель КО-80 | 3900000 | 78000 | 7800 |
| 5 | Емкость исходного масла ЕСМ 6 (м3) | 31200000 | 624000 | 62400 |
| 6 | Вертикальная ременная воздуходувка | 4260000 | 85200 | 8600 |
| 7 | Установка компрессорная ВК10-8 | 1380000 | 27600 | 2800 |
| 8 | Фильтр ВНП-40 | 108060000 | 2161200 | 216200 |
| 9 | Фильтр ВНП-40 | 108060000 | 2161200 | 216200 |
| 10 | Агрегат Ш 40/4-19,5/4 | 3780000 | 75600 | 7600 |
| 11 | Агрегат Ш 40/4-19.5/4 насос | 6120000 | 122400 | 12300 |
| 12 | Весы электронные автомобильные ВСА-60 | 73800000 | 1476000 | 147600 |
| 13 | Генератор бензиновый | 6060000 | 121200 | 12200 |
| 14 | Емкость 50 м³ | 14160000 | 283200 | 28400 |
| 15 | Зерносушилка типаS с оснащением | 276000000 | 5520000 | 552000 |
| 16 | Конвеер винтовой L-4,4м | 9120000 | 182400 | 18300 |
| 17 | Конвеер винтовой L-9м | 9300000 | 186000 | 18600 |
| 18 | Конвеер скребковый L-15,5м | 15120000 | 302400 | 30300 |
| 19 | Конвеер скребковый L-24м | 12600000 | 252000 | 25200 |
| 20 | Котел | 18720000 | 374400 | 37500 |
| 21 | Маслопресс 40р | 63000000 | 1260000 | 126000 |
| 22 | Маслопресс 40р | 63000000 | 1260000 | 126000 |
| 23 | Маслопресс 40р | 63000000 | 1260000 | 126000 |
| 24 | Маслопресс 40р | 63000000 | 1260000 | 126000 |
| 25 | ПЭВМ Дельта с монитором | 1800000 | 36000 | 3600 |
| 26 | ПЭВМ ПИЛОТ с МОНИТОРОМ | 1800000 | 36000 | 3600 |
| 27 | Установка для производства растительного масла | 57000000 | 1140000 | 114000 |
| 28 | Установка для производства растительного масла | 57000000 | 1140000 | 114000 |
| 29 | Установка для производства растительного масла | 57000000 | 1140000 | 114000 |
| 30 | Установка для производства растительного масла | 57000000 | 1140000 | 114000 |
| 31 | Установка для производства растительного масла | 57000000 | 1140000 | 114000 |
| 35 | электроводонагреватель ARISTON ABS PROR 150V | 1680000 | 33600 | 3400 |
| | Итого: | 1 250 460 000 | 25 009 200 | 2 501 800 |

**Продавец – ЗАО «Завод технических масел».**

*Реквизиты для перечисления задатка: Получатель ЗАО «Завод технических масел», УНП 790626434, р/с 3012115060019 в ОАО «Банк Москва-Минск», Управление по Могилевской обл., МФО 153001272, г. Могилев, задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также представившие организатору торгов следующие документы: заявление на участие в аукционе; копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на возможное понижение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона. В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по минимальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

**Аукцион состоится 30 декабря 2015 г. в 10.00 по адресу: Могилевская обл., г. Чаусы, ул. Производственная, 1А-2.**

**Заявки принимаются до 28 декабря 2015 по адресу: Могилевская обл., г. Чаусы, ул. Производственная, 1А-2.**

**Справки по телефону: 802242-29818.**

## Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ 29 декабря 2015 в 11.00 состоятся открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «ФанДОК» (продавец), одним лотом в составе:**

| | |
|---|---|
| **Лот № 1** (предмет торгов): кап. строение с инв. номером 701/С-7694 (автомастерская) общ. пл. 302,3 кв.м; кап. строение с инв. номером 701/С-7695 (кузница) общ. пл. 61,8 кв.м; кап. строение с инв. номером 701/С-7696 (кладовая) общ. пл. 26,0 кв.м, имеется дорожное покрытие асфальтированное пл. 2762 кв.м, забор, ворота, калитка, расположенные на земельном участке по адресу: Могилевская область, Белыничский район, Мощаницкий с/с, район д. Ослевка | |
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369 |
| **Продавец предмета торгов** | Открытое акционерное общество «ФанДОК», УНП 700060473, ОКПО 00276624, 213802, г. Бобруйск, ул. Ленина, 95, р/с 3012000000377 в ОАО «Беларусбанк» г. Бобруйска, ул. Горького, 2 филиал 703, код 153801760 |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54, г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |
| **Начальная цена продажи и размер задатка** | 215 000 000 рублей без учета НДС, задаток 10% – 21 500 000 рублей |
